ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 75 (2128)
16 верасня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

50 ГОД КАСТРЫЧНІКА
НАСУСТРАЧ ВЯЛІКАЙ ДАЦЕ

Генадзь Цітовіч:

ХАЙ ПЕСНЯ АДЛЮСТРУЕ ВЕЛІЧ НАШАГА ЧАСУ

Як адзначыць калектыў Народнага хору БССР слаўнае 50-годдзе Савецкай улады, якія новыя песні пачуем мы ў яго выкананні?

На стале ў мастацкага кіраўніка хору Генадзя Іванавіча Цітовіча стосы нот. Гэта — святочны рэпертуар.

— Да юбілею мы рыхтуем дзве новыя праграмы, — гаворыць Генадзь Іванавіч, — і адну, якая будзе складацца з лепшых нумароў ранейшых праграм.

— Генадзь Іванавіч, а ці не маглі б вы пералічыць некаторыя творы з новых праграм!

— Праграмы яшчэ не сфарміраваны, але асноўныя нумары ўжо вядомыя. Шмат гадоў, напрыклад, чакала свайго выканання песня А. Туранкова на словы Адама Русака «Велічальная». Паслухайце, якая цудоўная музыка!..

Генадзь Іванавіч ціха напявае.

— Мы хочам аднавіць у рэпертуары, — працягвае ён, — песню І. Любана «Бывайце здаровы». Народ гэтую песню не забыў, яна і сёння гучыць па-сучаснаму.

Новыя творы напісалі для нас Ул. Алоўнікаў, М. Аладаў, Ю. Семяняка. Збіраемся ўключыць у святочны рэпертуар і песню самадзейнага кампазітара з Хойнікаў Ул. Мердава «Наш гарадок». Словы піша Мікола Аўрамчык. Нашы цымбалісты развучваюць фрагменты з «Палескай сюіты» Я. Глебава.

Гутарка перапыняецца прыходам Адама Русака. Ён прынёс новыя песні. У садружнасці з Ул. Алоўнікавым паэт напісаў «Мінскую баладу» — яна таксама ўключана ў новую праграму. І яшчэ адна песня на словы А. Русака — лірычная.

— Горш з песнямі публіцыстычнымі, — уздыхае Генадзь Іванавіч. — Нам бы такую, як «Бухенвальдскі набат», пра барацьбу за мір, пра яднанне людзей. На жаль, няма такой. Няма і цікавай антырэлігійнай песні, давядзецца вяртацца да старых.

— Генадзь Іванавіч, а як фарміруецца юбілейны рэпертуар, чым вы кіруецеся, складаючы праграмы!

— Галоўнае месца адводзім беларускай песні, мы для таго жывём і працуем, каб прапагандаваць яе. Імкнёмся, каб кожны наш канцэрт стаў святам для слухачоў.

Наш субяседнік дастае тоўстую папку.

— Вось тут пісьмы. Мы атрымліваем іх вельмі многа. Слухачы часта самі падказваюць нумары, называюць песні, незаслужана забытыя. Па заяўках слухачоў, напрыклад, мы будзем выконваць у новай рэдакцыі рэвалюцыйную песню «Калодніка».

У нашых праграмах ёсць, калі можна так сказаць, свая драматургія. Адзін нумар вынікае з другога, служыць нібы яго працягам, і адвольна ўставіць або выкінуць нешта амаль немагчыма. Святочныя праграмы будуць пабудаваны па тым жа прынцыпе. Мы зробім іх тэматычнымі. Хочам, каб у рэпертуары знайшлі адлюстраванне розныя этапы станаўлення Савецкай дзяржавы.

— Хор, здаецца, яшчэ ў адпачынку. Як адпачываеце асабіста вы!

— Па палях ды па людзях блукаю, — усміхаецца Генадзь Іванавіч. — Толькі што вярнуўся з падарожжа па рэках Беларусі на маленькім чаўне. Слухаў і запісваў песні, збіраў гербарыі, фатаграфаваў, — словам, займаўся тым, без чаго нельга потым працаваць, — накопліваў уражанні. Заадно ўзяў на прыкмету некалькі спевакоў. Нельга ж нам забываць пра змену. Маладым трэба перадаць у спадчыну і наш вопыт, і нашы веды, і наша замілаванне народнай песняй...

Развітваемся. Генадзь Іванавіч зноў схіляецца над сталом. Кіраўніку калектыву трэба ўжо зараз вырашыць многія пытанні, ад якіх потым будзе залежаць лёс праграм. Праграмы ж незвычайныя. Яркім і запамінальным павінен быць у іх кожны нумар.

ХРОНІКА ЛІТАРАТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

НА «АГЕНЬЧЫКУ» — ПАЭЗІЯ

Гэтымі днямі ЦК ЛКСМБ праводзіў семінар загадчыкаў школьных аддзелаў райкомаў, гаркомаў камсамола рэспублікі. А потым камсамольскія работнікі сабраліся ў маладзёжным кафэ акруговага Дома афіцэраў на «Агеньчык». Да сябе ў госці яны запрасілі паэтаў Міколу Аўрамчыка, Эдзі Агняцвет, Алеся Бачылу, Рамана Гармолу, кампазітара Д. Камінскага. У непасрэднай, шчырай абстаноўцы доўга ў гэты вечар гучалі на «Агеньчыку» вершы, ішла размова аб паэзіі. Многія юнакі і дзяўчаты павезлі адсюль дадому кнігі з аўтографамі беларускіх паэтаў.

НАСУСТРАЧ 900-ГОДДЗЮ МІНСКА

Беларускія пісьменнікі распачынаюць праводзіць вечары, сустрэчы, прысвечаныя 900-годдзю Мінска. Такая сустрэча адбылася нядаўна ў доме адпачынку «Беларусь» у Ждановічах. Да адпачываючых прыйшлі пісьменнікі Уладзімір Карпаў і паэт Мікола Аўрамчык.

Пра шматвяковую гісторыю Мінска, пра яго гераічны лёс, пра яго светлы сённяшні дзень гаварыў Уладзімір Карпаў. Ён расказаў аб мінскім падполлі, аб тым, як адбудоўваўся горад, як на былых пустках вырасталі волаты-заводы... Пісьменнік прыпомніў, як ён пісаў свой раман аб аўтазаводзе і аўтазаводцах «Вясеннія ліўні», падзяліўся творчымі планамі. Яго новая кніга «Сотая маладосць» — аб сённяшнім Мінску і мінчанах.

Мікола Аўрамчык прачытаў прысутным свае вершы.

ПА СЛАВУТЫХ МЯСЦІНАХ

Цікавае падарожжа па літаратурных мясцінах Беларусі зрабілі гэтымі днямі студэнты 5-га курса факультэта мовы і літаратуры Брэсцкага педінстытута на чале са сваім выкладчыкам пісьменнікам Уладзімірам Калеснікам. Яны пабывалі на радзіме Адама Міцкевіча, наведалі музей вялікага польскага паэта ў Навагрудку. Запомняцца назаўсёды студэнтам і коласаўскія, купалаўскія мясціны — Акінчыцы, Вязынка... Пабывалі будучыя выкладчыкі мовы і літаратуры і на радзіме Францішка Багушэвіча.

З захапленнем студэнты аглядалі і памятныя мясціны Вільнюса. У багатай бібліятэцы Вільнюскага універсітэта пяцікурснікі пазнаёміліся са старадаўнімі беларускімі кнігамі. Яны пабывалі ля домікаў, дзе жыў Янка Купала, дзе выдавалася «Наша ніва», на месцы, дзе быў пакараны смерцю Кастусь Каліноўскі...

Падарожжа пакінула вялікае ўражанне ў студэнтаў.

ГОСЦІ — УЗБЕКСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

У дом творчасці Саюза пісьменнікаў БССР «Раліпічавічы» прыехалі нядаўна пісьменнікі з Ташкента Тураб Тула Тулахаджаеў, Кадыраў Прымкул Кадыравіч і Нагіраў Хакім Назіравіч. У Беларусі ўсе трое ўпершыню. Узбекскія госці будуць адпачываць, займацца творчасцю, сустрэнуцца з беларускімі літаратарамі, пазнаёмяцца з Мінскам.

ВЫДАДЗЕНА НА РУСКАЙ МОВЕ

Першы зборнік вершаў Рыгора Барадуліна на рускай мове «Целиноград» выйшаў у Маскве ў 1961 годзе. І вось нядаўна выдавецтва «Молодая гвардия» выпусціла другую кніжку паэта — «Аисты над крышами». Пераклады вершаў зрабіў Ігар Шклярэўскі.



Добры сябар у чытачоў з вёскі Кульшычы Слаўгарадскага раёна — загадчыца бібліятэкі Ганна Лаўрэнава. З ёю заўсёды цікава пагаварыць і аб жыцці, і аб навінках літаратуры, і аб прачытаных кнігах. Вось і зараз Ганна Арсеньеўна (у цэнтры) размаўляе са сваімі чытачамі.

Фота В. БЫСАВА.

РАЯЦЦА РАБОТНІКІ МУЗЕЯЎ

Двухдзённы семінар дырэктараў музеяў рэспублікі, які адбыўся ў Мінску, быў прысвечаны падрыхтоўцы музеяў да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. З дакладамі па гэтаму пытанню выступілі дырэктары музеяў: Баранавіцкага — Н. Марыновіч, Крычаўскага — Ф. Мельнікаў, Тураўскага — П. Шчыкатовіч, Бярозаўскага — Я. Бажок, Ваўкавыскага — Г. Пех.

На семінары таксама былі заслуханы даклады намесніка міністра культуры БССР Р. Мачуліна аб мерапрыемствах Міністэрства культуры БССР па паляпшэнню выхаваўчай і прапагандысцкай работы музеяў рэспублікі і Р. Доўнар-Запольскай аб захаванні і ўліку экспанатаў у фондасховішчы Дзяржаўнага музея БССР.

З прамовай выступіў міністр культуры БССР М. Мінковіч.

□ □ □

Днямі калегія Міністэрства культуры БССР зацвердзіла мерапрыемствы Міністэрства культуры па паляпшэнню выхаваўчай і прапагандысцкай работы музеяў рэспублікі. Калегія прапанавала музеям рэспублікі да 1 студзеня 1967 года перагледзець свае экспазіцыі з тым, каб яны на высокім ідэйна-палітычным узроўні шырока адлюстроўвалі заваёвы Вялікага Кастрычніка на беларускай зямлі.

Прапанавана разам з актывам музеяў, з дапамогай грамадскіх арганізацый выявіць актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху на Беларусі, былых камандзіраў і палітработнікаў Савецкай Арміі, падпольшчыкаў і партызан свайго раёна, вобласці.

Кожны музей правядзе цыкл лекцый і дакладаў па рэвалюцыйнай, ваенна-патрыятычнай і працоўнай тэматыцы на прадпрыемствах, будоўлях, у калгасах і саўгасах. Больш увагі будзе аддавацца правядзенню і арганізацыі экскурсій па залах музеяў і памятных мясцінах, сустрэчам са знатнымі людзьмі рэспублікі, стварэнню пры музеях клубаў баявой і рэвалюцыйнай славы.

Пры Дзяржаўным музеі БССР ствараецца рэспубліканскі метадычны савет на грамадскіх асновах, мэта якога — кіраваць работай грамадскіх музеяў баявой і працоўнай славы.

Чалавек — тэхніка — прыгажосць

ВІЗІТНАЯ КАРТКА ВЫРАБУ

У свой час Ул. Маякоўскі ў нататках аб агітацыі і рэкламе пісаў: «У кожнай... перамозе, у кожнай гаспадарчай удачы на 9/10 адбіваецца ўменне і сіла нашай агітацыі. Рэклама — прамысловая, гандлёвая агітацыя». Там жа ён гаворыць, як пасля грамадзянскай вайны мы няўмела ўзяліся за рэкламу — пачалі ўжываць сухія канцылярскія звароты ў газетах: «паведамляе, аб'яўляе, даводзіць да ведама»...

Значэнне рэкламы ў гандлі цяжка пераацаніць. Яна не толькі прапагандуе тавары, але і павышае культуру быту, выхоўвае эстэтычны густ людзей. І таму крыўдна, што ў нашай рэспубліцы гандлёвая рэклама пакуль што не заўсёды адпавядае свайму прызначэнню. Вельмі часта яна робіцца неахайна.

Напрыклад, абутак упакоўваецца ў нязграбныя каробкі з непрыгожым малюнкам. Ярлыкі на нашых таварах старамодныя, аднастайныя, аднакаляровыя, зроблены з дрэннай паперы. Гэта асабліва кідаецца ў вочы ў параўнанні з ярлыкамі, этыкеткамі, упакоўкамі імпартных тавараў. Прыгожа скампанаваныя, лаканічныя этыкеткі, яркі шматкаляровы друк на метале або пластмасавай паверхні, удала зробленая ўпакоўка — усё гэта выгадна адрознівае тавары фінскіх фармацэўтычных фірм, парфюмерных фірм ГДР і інш.

Яшчэ сустракаецца ў нас мудрагелістае афармленне цукерачных і парфюмерных каробак з галоўкамі прыгажунь а ля Кармэн, антымастацкае афармленне запалкавых карабкоў.

Такое становішча ў гандлёвай рэкламе ў нас склалася таму, што мы да апошняга часу аддавалі ёй вельмі мала ўвагі. Мастакі адносяцца да гэтай работы як да другараднай. А добрыя мастакі наогул лічаць ніжэй свайго гонару ствараць «розныя этыкеткі». З другога боку, кіраўнікі — і прамысловых прадпрыемстваў, і гандлёвых — не надаюць рэкламе вялікага значэння, зусім не клапоцяцца пра яе мастацкі бок. І ў выніку мы сутыкаемся на кожным кроку з безгустоўшчынай.

Праўда, у апошні час справа зрушыла з месца. Прадпрыемствы пачалі больш прыгожа рабіць розныя «суправазілаўкі» да сваіх тавараў, больш увагі ўдзяляе рэкламе і гандаль. На многіх таварах з'явіліся цікавыя таварныя знакі або, інакш кажучы, своеасаблівыя візітныя карткі вырабаў.

Вось пра іх мне і хочацца пагаварыць у гэтым артыкуле.

Таварны знак з'яўляецца неад'емным дадаткам да самога вырабу. Ён змяшчаецца звычайна на самой рэчы ці, калі рэч вельмі маленькая, — на яе ўпакоўцы.

Як твор графічнага прыкладнога мастацтва таварны знак садзейнічае фарміраванню густу пакупніка. Цяпер знакі шырока ўвайшлі ў наш быт. Усім, напрыклад, добра вядомыя знакі Мінскага трактарнага завода, гродзенскага завода «Электрасвятло», Віцебскай шоўкаткацкай фабрыкі і інш.

Да 1962 года большасць прадпрыемстваў Беларусі не рэгістравала таварных знакаў, таму яны рабіліся бескантрольна і не вельмі ўдала. Пасля пастановы Савета Міністраў СССР «Аб таварным знаку», якая ўвяла знак у якасці адзінага віду маркіроўкі прамысловай прадукцыі і тавараў народнага ўжытку, Беларускі аддзел Усесаюзнай гандлёвай палаты за апошнія два-тры гады не толькі распрацаваў сімвалы прадпрыемстваў, якія да яго звярнуліся, але і аформіў іх рэгістрацыю ў Камітэце па справах вынаходстваў і адкрыццяў пры Савеце Міністраў СССР, атрымаўшы адпаведныя пасведчанні. Такіх таварных знакаў зарэгістравана ў рэспубліцы больш чым шэсцьсот.

Як бачым, мастацтва таварнага знаку ў нашай краіне вельмі маладое, тут яшчэ няма пэўных законаў іх падачы і афармлення, але ўжо і за гэтыя некалькі год накоплены такі-сякі вопыт, які не шкодзіла б ужо сёння неяк абагуліць.

Спачатку, для агульнага азнаямлення крыху гісторыі.

У 1954 годзе цэх прамысловай графікі Маскоўскага аддзялення Саюза мастакоў СССР упершыню атрымаў вялікі заказ на таварныя знакі для тэкстыльных фабрык краіны. А першая выстаўка савецкага таварнага знаку была ў Маскве чатыры гады назад. Мастакам было цяжка адразу зламаць рамесніцкія традыцыі 40-х—50-х гадоў, калі ў знак уключалі не толькі дакладна намаляваны выраб, але і назву завода, міністэрства, паштовы адрас. Але паступова з'явіліся сучасныя па малюнку знакі. Імёны В. Акопава, Г. Блюм, Е. Гальперынай, Э. Гурвіч, Г. Шчацініна, якія працуюць у гэтай галіне, сёння вядомы аматарам прыкладной графікі.

Значнае развіццё мастацтва таварнага знаку атрымала і ў нашай рэспубліцы.

Вось таварны знак Мінскага малочнага камбіната. Тут намаляваны збан, які падзелены на дзве паловінкі, злучаныя ручкай. Пад збанам — галава каровы з рагамі. І хоць таварны знак сваю функцыю выконвае, ён усё ж занадта ўскладнёны. Гэта больш натуралістычны малюнак, чым сімвал.

Таварны знак Краснапалескага рыбзавода Гомельскай вобласці шрыфтовага тыпу. Тут злучаны літары «Р» і «З», яны закампанаваны ў зубчатым арнаментальным акаймаванні. Але ўсё ж знак не зусім удала вырашаны ў мастацкіх адносінах. Трансфармаваныя літары не зліваюцца ў своеасаблівы рытмічны арнамент.

Больш удалае вобразнае вырашэнне знаку Гродзенскага завода «Электрасвятло». Літара «Э» знаходзіцца ў цэнтры круга, вакол якога рытмічна разыходзяцца языкі полымя. Гэта дынамічная метафара добра раскрывае прызначэнне прадукцыі.

Некаторыя нашы таварныя знакі зроблены наспех. Відаць, не вельмі доўга раздумваў мастак над таварным знакам для вытворчага аб'яднання «Праца» (Гомель). Ён проста намаляваў ката ў ботах са шпорай. Бедны кот! Ён прыйшоў сюды быццам з ігральных картаў і шакладных абгортак. Не, мы не супраць малюнкаў жывёл. І тут можна знайсці цікавае вырашэнне. Напрыклад, возьмем таварны знак Мазырскай трыкатажна-ткацкай фабрыкі. На абагуленым чорна-белым малюнку паказана мышка. Мастак у разліку на нечаканасць асацыяцыі даў вобраз-сімвал прадпрыемства. Ткацкі чаўнок снуе, як мышка! Таварны знак, зразумела, — сур'ёзная інфармацыя аб прадпрыемстве. Але ж сур'ёзнасць зусім не выключае дасціпнасці.

Некаторыя таварныя знакі беларускіх прадпрыемстваў падобны на рэбусы. Гэта таксама дрэнна. Пакупнік не можа адразу здагадацца аб профілі завода. Цяжка расшыфраваць сімвал, які мае Магілёўскі мясакамбінат. Мастак прапанаваў складаную кампазіцыю. Ён нахіліў улева літару «К», дамаляваў да яе галаву каровы, а справа прымацаваў колца, якое, відаць, абазначае каўбасу.

Таварныя знакі заводаў, якія вырабляюць віно, пладова-ягадныя кансервы, напіткі і інш., чамусьці маюць «вечныя» атрыбуты — тут намаляваны лісты, ягады, садавіна. Сімвалам лесапільных, мэблевых, дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў найчасцей з'яўляецца нейкае дрэва. Адзін час Камітэт па справах вынаходстваў і адкрыццяў пры Савеце Міністраў СССР перастаў рэгістраваць знакі са стылізаванымі дрэвамі. Але ж можна і тут прыдумаць нешта цікавае! Паглядзіце на цудоўны таварны знак мастака В. Акопава для прадпрыемстваў, якія выробляюць зборныя драўляныя дамы. Мастак намаляваў елкі — складзены яны так, што ўтвараюць дом з комінам. Пры гэтым кожная елка падобна на чарцёж. Гэтая асацыяцыя добра перадае характар завода.

Увогуле ж трэба сказаць, што мы маем яшчэ вельмі мала добрых у мастацкіх адносінах таварных знакаў. Часта можна бачыць у якасці сімвалаў натуралістычныя перамалёўкі вырабаў або фабрычных карпусоў, выкананыя не па-мастацку.

Дзіву даешся, што некаторыя добрыя заводы да гэтага часу не маюць сваёй маркі. Падумаць толькі: славуты шклозавод «Нёман», вырабы якога вядомыя не толькі ў Савецкім Саюзе, але і далёка за яго межамі, не мае свайго знаку! Не мае знаку і Мастацкі фонд БССР. Цяпер цяжка што-небудзь прапанаваць у галіне паляпшэння стану беларускай прыкладной графікі — гэта справа спецыялістаў, — але ясна адно: да гэтай важнай работы трэба прыцягнуць і членаў Саюза мастакоў БССР, і маладых мастакоў, нядаўніх выпускнікоў Мінскага мастацкага вучылішча і Тэатральна-мастацкага інстытута, якія маюць жаданне працаваць у гэтай галіне.

А чаму б пры Беларускім філіяле навукова-даследчага інстытута тэхнічнай эстэтыкі не арганізаваць спецыяльнага аддзела мастацкага афармлення, упакоўкі і маркіроўкі ці штосьці накшталт гэтага? Падобныя аддзелы працуюць у Львове, Ленінградзе, Маскве, Вільнюсе і іншых гарадах.

У маі 1967 года ў Мінску арганізуецца рэспубліканская выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Адзін з яе раздзелаў складзе прамысловая і прыкладная графіка (рэкламныя лісты, упакоўкі, праспекты, каталогі, таварныя знакі і г. д.). Мне здаецца, якраз на гэтай выстаўцы неабходна будзе проціпаставіць непрафесіянальным антымастацкім вырашэнням, шэрасці і старамоднасці ўсё тое, на жаль, пакуль нямногае лепшае, што ёсць сёння ў беларускай прыкладной графіцы, і давесці, што гэтае мастацтва павінна стаць такім жа раўнапраўным, як і станковая графіка.

Задач, якія стаяць перад беларускай прыкладной графікай, вельмі многа — і цяжкіх. Каб паспяхова іх вырашыць, трэба паставіцца да іх як да часткі агульных задач усяго выяўленчага мастацтва Беларусі.

Барыс КРЭПАК.

18 ВЕРАСНЯ — ДЗЕНЬ РАБОТНІКА ЛЕСУ

Вы любіце асенні лес? Сёння раніцаю ён стаяў у белым тумане, які, нібы ватай, ахутаў кожнае дрэва. І цяжка здагадацца, ці то бяроза перад табою, ці вольха, ці ліпка. Пахне прэлым лісцем, мокрай зямлёй, і яшчэ аднекуль цягне дымком. Ціха. Так ціха, што, здаецца, на сто вёрст наваколь няма жывога.

Праходзіць паўгадзіны, і вы раптам адчулі, што нешта адбылося ў лесе. Пасвятлела, ці што? Вы задралі галаву і, не жмурачыся, глядзіце ўгару. Праз малочную пялёнку ўгадваецца светлая пляма — сонца.

Яшчэ сотня-другая крокаў, і раптам вакол усё змянілася. Дзе дзеўся той туман? Сонца тысячамі стрэлаў пранізала лес, умомант высушыла яго, пафарбавала ва ўсе колеры вясёлкі. Неналькі хвілін назад лісце пад нагамі было чорнае, а цяпер нібы хто мазнуў па ім свежымі фарбамі: чырвонай, жоўтай, карычневай, залатой...

Прашаляцела ўверсе, мацней запахла дымам (недзе паляць лісце), і міжволі прыцішшуй крокі, і адчуў, як на сэрца кладзецца ціхая радасць і, здаецца, не пайшоў бы ад гэтага хараства ніколі...

Бадай, няма такога пісьменніка, які б не прысвяціў лесу хоць некалькі ад сэрца напісаных радкоў. Няма, відаць, такога мастака ці кампазітара, якога б не ўсхваляваў, не натхніў лес.

Што за сіла ў ім? Чым вабіць ён? Тым, што ножнае дрэва — гэта столькі і столькі кубаметраў драўніны? Не, відаць, хоць і гэта вельмі важна. Тым, што лес, «зялёны сябар чалавека», дае здароўе? Не, відаць, хоць і гэта таксама вельмі важна. Тым, што ў цяжкія гады Айчыннай вайны быў родным домам для народных мсціўцаў? І не толькі таму.

А любім мы лес перш-наперш за тое, што гэта кавалак нашай роднай зямлі. Такі кавалак, дзе нібы сканцэнтравалася няхітрая, але хвалюючая прыгажосць беларускага краю.

А цяпер трошкі пра іншае. Будзем глядзець праўдзе ў вочы. Пакуль што аб'ектыўна атрымліваецца так — паэты і кампазітары прысвячаюць лесу гімны, а лесу ў гэты час становіцца ўсё менш і менш.

Так, співаць сасну можна за некалькі хвілін, а расці ёй амаль стагоддзе...

18 верасня мы ўпершыню будзем адзначаць Дзень работнікаў лесу. Гэта вельмі добра, што, нарэшце, ёсць сваё свята і ў людзей, якія носяць у пятліцах форменных куртак кляновыя лісточкі. Гэтыя людзі робяць вельмі важную, вельмі адказную справу — ахоўваюць, вырошчваюць лес — наша багацце, нашу прыгажосць. Гэтым людзям — наша пашана, гэтым людзям — наша дзякуй.

У ЛАНЦАВЫМ ЛОЗЕ

Лес быў на многія кіламетры. Сосны і яліны змяняліся бярэзнікам. Потым ішлі вольхі. Крышку збоку — таполі...

Ніхто не ведаў, колькі год лесу. Можа дзвесце, а можа і больш. Колькі тут жылі людзі, столькі, здавалася, і стаяў лес.

Але аднойчы зімовым ранкам цішыню яго абудзіў стук сякер, віск піл. Варшаўскі памешчык Фелікс Седляноўскі задаволена паціраў рукі. Ён ліхаманкава бегаў ад аднаго дрэва да другога, падганяў лесарубаў... А праз год памешчык прадаваў надзелы ў Ланцавым Лозе — там, дзе яшчэ нядаўна стаялі карабельныя сосны, гаманілі з небам высачэзныя елкі... Прадаваў надзелы зімою, каб людзі не бачылі, якую зямлю яны бяруць. А каб яны, барані божа, не падумалі, што тутэйшая зямліца — пясочак, тамсям пакапаны былі ямкі, а каля іх накіданы грудкі гліны. Не паленаваўся памешчык, прывёз гліну аж з-пад самых Баранавіч. І пайшлі дзялянкі за маліну. Ім, беззямельным сялянам былой панскай Польшчы, іншага выйсця не было. А тут яшчэ ж суглінкі! І толькі вясною людзі ўбачылі, якую зямлю прадаў ім памешчык Седляноўскі. Але што зробіш? Усё, што было ў іх, што збіралі па залатоўцы гадамі, уклалі ў гэтыя пяскі. Але не давялося перасяленцам пакаштаваць хлеба з ланцаўскіх надзелаў. Вызвалены з-пад лесу пясок — вось хто стаў тут гаспадаром. Ён зсыпаў рэдзенькія пасевы, насядаў на хутары. І кінулі набытую зямлю і паехалі парабкаваць у Польшчу Станіслаў Баронь, Ян Возняк, Уладыслаў Мазур і многія іншыя. Адзін Адам Савінскі застаўся. Ён пасадзіў каля свайго хутара зялёны заслон сасёнак, вішань, дзічак. І пясок не мог адолець гэты заслон.

Адам Савінскі і расказаў нам пра гэтую гісторыю. Прыпомніў, як сяляне, пакідаючы ўжо абжытае месца, гаварылі: «Вялікае поле Ланцаў Лог, а няма хлеба — не даў бог»...

Як акінуць вокам — зялёнае мора — маладыя сасонкі ўперамешку з тонкімі бярозкамі. Дрэўцы роўненькія, нібы падстрыжаныя пад грэбень. Колькі тут маладога лесу — сотні ці мо тысячы гектараў? Лясгасаўскі «газік» ужо з дзесятак кіламетраў бяжыць па гэтым зялёным моры, а яму і канца няма. Лес ды лес... Іншы раз выскачыць к дарозе купка ссохлага вішняку — напамінак аб былым хутары — і зноў малады сасоннік.

Нас у машыне трое: дырэктар Баранавіцкага лясгаса Пятро Данілавіч Клімянкоў — высокі, разважны мужчына са спакойным позіркам і каржакаваты Аляксей Андрэевіч Бацян — ляснічы Міладзідаўскага лясніцтва. Гэта яны галоўныя ініцыятары пакарэння пяскоў Ланцавага Логу. Я слухаю іх гутарку і думаю пра тое, што трэба вельмі любіць лес, каб прысвяціць сваё жыццё яму і ў той жа час усведамляць, што ніколі не ўбачыш канчатковых вынікаў сваёй працы. Сапраўды ж, рабочы на заводзе бачыць вынік працы сваёй адразу — у вытачанай дэталі станка ці машыны, у самой машыне; хлебароб знімае ўраджай у той жа год, садоўнік — праз сем-восем гадоў. А лесавод? Лес жа вырастае праз восемдзесят-сто гадоў...

— Нямала давялося пахадзіць да рознага начальства, перш чым ланцаўскія пяскі перадалі лясгасу, — гаворыць Пятро Данілавіч. — Памятаю, прыйшоў у адзін кабінет і чую: «Хіба вы, таварыш, дзяржаўнай палітыкі не разумееце? Лес — гэта будаўнічы матэрыял, яго высякаць трэба, а вы прапануеце на асвоеных землях дрэвы садзіць...

А ланцаўскія пяскі між тым пашыраліся, набіралі сілу. Ужо ім стала цесна на трох тысячах гектараў былых высечак. Пяскі паўзлі па полі, пачалі падбіраць пад сябе стараворныя землі калгасаў...

Толькі ў 1961 годзе Ланцаў Лог перадалі лясгасу. Многа трэба было пакласці працы, каб на пустых пясках вырас лес. Ды на такой вялікай плошчы! Спачатку трэба было закласці гадавальнік, вырасціць пасадачны матэрыял. Месца для гадавальніка выбралі на раскарчаваных землях. Навазілі туды торфу, гною, насыпалі мінеральных тукаў.

Праз год вырашчанымі ў гадавальніку сеянцамі ўжо можна было садзіць лес. А якая гэта складаная і адказная работа! Лес вясною трэба пасадзіць у самыя ранніх і сціслыя тэрміны — пакуль у глебе многа вільгаці. А інакш марныя будуць усе стараннi. Папрасілі дапамогі ў суседніх калгасаў.

І зноў вырас на Ланцавым Лозе лес! Вунь які ўжо — у рост чалавека!

Ціха ў лесе. Ціха і цяпер, вераснёвым днём, трошкі сумна. Мы многа сёння паездзілі і цяпер збочылі ў лес, каб трошкі адпачыць. А гутарка ўсё роўна ўвесь час вядзецца вакол адной тэмы — лесу.

— Ну, праўда, будуюць у нас многа, — гарачыцца ляснічы. — Але ж лес — не бяздонная бочка. Колькі можна браць ад яго?

— Трэба шукаць замену, — падтрымлівае ляснічага Клімянкоў, — цэглу, цэмент, вапну. Каб драўніну браць толькі на самае неабходнае, дзе без яе ўжо не абыдзешся. Не разумею, чаму ў апошнія гады ўсюды закрылі невялікія цагельныя заводы, кар'еры па здабычы вапняковага каменя?

Гутарка закранае і такое пытанне: вельмі ж неразумна выкарыстоўваюць драўніну мэблевыя фабрыкі і лесапільныя заводы — паляць або вывозяць на звалкі шмат каштоўных адыходаў.

— Толькі ў зоне Баранавіч такіх заводаў больш дзесятка, — гаворыць Пятро Данілавіч.

...Непрыкметна набліжаецца вечар. У лесе згушчаюцца прыцемкі. Цішыню толькі парушае грукат трактара, што працуе паблізу на маладых пасевах лесу.

С. ПРОЦЬКА.

КРОКІ ФЕСТЫВАЛЮ

КІРУНАК—НА ЎЗДЫМ

Завяршаюцца сельскагаспадарчыя работы, мінуў час летніх адпачынкаў гараджан. Цяпер — самая пара рэпетыцый у самадзейных калектывах. Аматары сцэны рыхтуюць да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, новыя пастаноўкі, канцэртныя праграмы.

Рэдакцыя звярнулася да некаторых рэжысёраў народных тэатраў, кіраўнікоў драматычных калектываў з просьбай расказаць, як яны сустракаюць 50-годдзе Вялікага Кастрычніка, у чым сёння маюць найбольшую патрэбу, што перашкаджае ім у рабоце. Вось што яны расказалі:

Б. ШУРЫН,
рэжысёр Бабруйскага народнага тэатра клуба мясцовай прамысловасці

— У сакавіку нашаму калектыву споўнілася семнаццаць год. Гэты юбілей мы вырашылі адзначыць своеасаблівым аглядам творчых сіл. Сёлета правялі тыдзень мастацтва, за час якога гледачам паказалі сем сваіх лепшых спектакляў: «Апошнія», «Платон Крэчат», «Маці сваіх дзяцей», «Чамадан з наклейкамі», «Апошняя ноч», «Ганарліўка», «Ваўкі ў горадзе». Паказы суправаджаліся лекцыямі на тэмы: «Вобраз Леніна ў савецкай драматургіі», «Наш сучаснік на сцэне» і іншымі.

У юбілейным, 1967 годзе, думаем правесці другі тыдзень мастацтва. Для гэтага адновім такія нашы спектаклі, як «Папараць-кветка», «Іркуцкая гісторыя», «Барабаншчыца». Давядзецца нямала папрацаваць, каб гэтыя пастаноўкі зноў прыцягнулі ўвагу гледача.

А цяпер наш галоўны клопат — да 50-годдзя Савецкай улады падрыхтаваць новы спектакль на гісторыка-рэвалюцыйную тэму — «Разлом» Б. Лаўранёва. Нашы акцёры працуюць над п'есай з вялікім натхненнем. У спектаклі занята 45 чалавек. У галоўных ролях выступяць: слесар завода «Сельмаш» Яўген Кіявіцкі (Гадун), бібліятэкарка Людміла Дунаева (Таццяна), швачка Ніна Шыдлоўская (Соф'я Пятроўна), інжынер Генадзь Саўрухін (Штубэ).

Свае спектаклі пакажам і сельскаму гледачу. Сёлета з нашымі пастаноўкамі пазнаёміліся хлебаробы калгасаў імя Леніна, імя Мічурына і іншых гаспадарак раёна.

Хацелася б хутчэй вырашыць такое пытанне. Чытаеш газеты, і часта мільгаюць паведамленні аб тым, што танцавальныя калектывы, народныя хоры, ансамблі песні і танца выступаюць у Мінску, у Маскве. Мы цярпліва чакаем, калі, нарэшце, і да нас дойдзе чарга. Пакуль што для нас падзея — выступленне ў абласным цэнтры. За апошнія тры гады такое свята было адзін раз.

М. ІЛЫЧОЎ,
кіраўнік драматычнага калектыву Барысаўскага фанера-запалкавага камбіната.

— Наш калектыў працуе сістэматычна, ён аб'ядноўвае нямала энтузіястаў самадзейнай сцэны. Сярод іх мне ў першую чаргу хочацца назваць сакратара партыйнай арганізацыі В. Кулакоўскага, інжынера М. Жыдаліс і іншых.

У рэпертуары калектыву спектаклі «На паўночны захад ад Берліна», «Выбух», «Не верце цішыні», «У пошуках радасці», «Фабрычная дзяўчына». Усе гэтыя спектаклі мы паказвалі на сваім і суседніх прадпрыемствах.

Мы вельмі хацелі б да 50-годдзя Савецкай улады паставіць невялікі спектакль на гісторыка-рэвалюцыйную тэму беларускага аўтара. На жаль, такой п'есы пакуль не знайшлі. Рэпеціруем цяпер п'есу А. Арбузава «Іркуцкая гісторыя». Неўзабаве адбудзецца прэм'ера. Гэты спектакль пакажам на фестывалі.

М. ВАСІЛЕЎСКІ,
рэжысёр народнага тэатра Маладзечанскай мэблевай фабрыкі

— Мы яшчэ не вызначылі канчаткова твор, па якім будзем рыхтаваць спектакль да 50-годдзя Савецкай улады. Абмяркоўваем дзве п'есы: «Сэрца на далоні» І. Шамякіна і «Равесніц навальніцы» Ц. Саладара. Адну з іх абавязкова ў бліжэйшы час запусцім у работу.

Летні час мы шырока выкарысталі для выездаў. Пабывалі ў Мядзелі, Крывічах, Валожыне, Будславе, у дамах адпачынку «Нарач» і «Ждановічы», у калгасах «17 верасня» і «Кастрычнік». Маем ужо на сваім рахунку 19 выязных спектакляў. Паказвалі гледачам нашу новую работу — спектакль «Палкоўнік неспакойнай службы». Да канца года плануем яшчэ не менш дваццаці выездаў.

У гэтым кароткім інтэрв'ю мне хочацца ўзняць пытанне аб шэфстве прафесіянальных майстроў над самадзейнасцю. Калі мы хочам добра падрыхтавацца да фестывалю, без дапамогі тэатраў не абысціся. У нас усталявалася даўняя дружба з тэатрам юнага гледача. Мастакі тэатра І. Пешкур і В. Хартаў — нашы частыя госці. Яны памагаюць афармляць усе нашы спектаклі. За гэтую бескарыслівую дапамогу мы шчыра ўдзячны тэатру. У сваю чаргу і наш калектыў цікавіцца работай драматычных гурткоў швейнай фабрыкі і гархарчпрамгандлю.

У нашым тэатры ёсць нямала здольных людзей, улюбёных у тэатральнае мастацтва. З аднаго толькі механічнага цэха мэблевай фабрыкі ў спектаклях удзельнічаюць дванаццаць чалавек. Вельмі многа нам памагае дырэктар прадпрыемства Г. Ліпаўка.

Наш тэатр мог бы працаваць больш актыўна, але ўмовы для работы надзвычай цяжкія. Мэблевая фабрыка не мае клуба, і рэпетыцыі даводзіцца праводзіць часам у цэху, чырвоным кутку, кабінеце дырэктара. Гэта, вядома, значна ўскладняе работу.

І. СВІСТУНОЎ,
кіраўнік драматычнага гуртка Радашковіцкага прамкамбіната Мінскай вобласці

— Наш драматычны гурток нарадзіўся некалькі месяцаў назад. Зразумела, што мы перажываем нямала цяжкасцей. Вельмі патрэбны нам кваліфікаваныя парады рэжысёра. Хацелася б таксама і рэпертуар падабраць баявы, надзённы — аб нашым сучасніку. Але ж аднаактовых п'ес мала.

Нядаўна адбыліся прэм'еры дзвюх невялікіх п'ес: «Званок на дачы» і «Фабрыкант». Першая — на вытворчую тэматыку, другая — пра калгаснае жыццё. Паказвалі іх у Радашковічах. Гледачам спадабаліся. Пра планы на будучыню пакуль што не магу сказаць нічога пэўнага. Шукаем рэпертуар, спадзяёмся на дапамогу аднаго з тэатраў Мінска.

М. МАНОХІН,
рэжысёр Полацкага народнага тэатра

— Да 50-годдзя Савецкай улады рыхтуем спектакль па п'есе А. Галіева «Ігла і штых», якая ўзнаўляе рамантыку барацьбы за Савецкую ўладу ў гады грамадзянскай вайны. Адначасова працуем над драмай В. Розава «Забаўнік». Ставіць гэты спектакль акцёр нашага тэатра Барыс Брагуноў. Гэта будзе яго другая самастойная рэжысёрская работа. Першы раз ён ставіў аднаактовы спектакль на антырэлігійную тэму, які карыстаўся поспехам.

Не забываем мы і пра свае шэфскія абавязкі. Пры чыгуначнай школе стварылі піянерскі тэатр, якім кіруе артыстка нашага тэатра Тамара Філіпава.

Акрамя спектакляў у горадзе, часта выязджаем у калгасы і саўгасы, на прадпрыемствы. Сёлета адбылося 15 выязных спектакляў.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

БАГАЦЦЕ ПАЛІТРЫ

ДА 50-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Л. МАЦІСАВАЙ

Наша першае знаёмства з цяперашняй заслужанай артысткай БССР Лізаветай Мацісавай адбылося яшчэ на спектаклях Беларускага тэатра музычнай камедыі неўзабаве пасля вайны. У аперэтах Кальмана і Легара артыстка выконвала каскадныя ролі. Лірыка-камедыйныя дуэты «субрэткі» і «прастака» захаплялі яркай эмацыянальнасцю, пластычнасцю, тонкім гумарам і бездакорнай музычнасцю. Амаль заўсёды актрысе даводзілася паўтараць куплеты і эксцэнтрычныя танцы на біс. Аматары аперэты звычайна пыталіся ў тэатральнай касе, ці ўдзельнічае ў спектаклі іх любімица. Здавалася, што Мацісава народжана для лёгкага жанру і толькі ў ім яе акцёрскае прызванне.

Аднак, ужо ў той час, параўноўваючы вобразы, якія стварала артыстка, з ролямі гэтага ж плана ў выкананні іншых «субрэтак», можна было заўважыць індывідуальныя асаблівасці манеры: Мацісава пазбягала таннай меладраматычнасці, сентыментальнага пафасу, фарсавага трукацтва.

У аперэтачных пастаноўках, асабліва ў той час, нярэдка бытавалі рамесніцкія шаблоны, паўтарэнне ў кожным спектаклі аднойчы знойдзеных сцэнічных прыёмаў. Аднак Л. Мацісава шукала для сваіх гераінь новыя рысы. І часта знаходзіла іх.

Потым мы сустрэліся з таленавітай артысткай у спектаклях тэатра імя Якуба Коласа, дзе яна працуе з 1951 года. Тут асабліва поўна і разнастайна раскрыліся здольнасці, вызначыўся эстэтычны густ і высветлілася грамадзянская пазіцыя Мацісавай у мастацтве.

Асабліва ярка раскрыўся талент актрысы ў ролі Зоські («Раскіданае гняздо» Янкі Купалы). Гэта было адкрыццё новага, самабытнага характару. Спектакль вырашаўся коласаўцамі (рэжысёр А. Скібнеўскі) як народная трагедыя. На сцэне была ўвасоблена тэма дарэвалюцыйнай купалаўскай творчасці—заклік мужыка-беларуса, «пана сахі і касы», весці барацьбу за права «людзьмі звацца». У вобразе Зоські — Мацісавай галоўным быў канфлікт шчырага паэтычнага сэрца з жорсткай рэчаіснасцю. Светлыя мары Зоські сутыкнуліся з воўчымі законамі тагачаснага грамадства. Гераіня гінула, але не скаралася цёмнаму царству і заставалася «светлым промнем» у ім. Асабліва высокага драматычнага напружання дасягала сцэна варяцтва Зоські.

Ёсць мастакі рознага кірунку. Некаторыя ідуць да вобраза шляхам філасофскага раскрыцця яго галоўнай тэмы. У іншых — пераважаюць эмацыянальны пачатак, інтуіцыя. Л. Мацісава належыць да апошніх. Возьмем, да прыкладу, яе Таццяну Лугавую («Ворагі» М. Горкага, рэжысёр І. Раеўскі). У вобразе не было глыбокага абагульнення. Вонкавая і душэўная грацыя, мяккая сардэчнасць і сціпласць пачуццяў, сумненні ў вызначэнні жыццёвай пазіцыі гераіні — вось што выходзіла на першы план. У час паказу спектакля на Дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве (1955 год) крытыка адзначала, гаворачы пра работу Мацісавай, што ідэйная эвалюцыя Лугавой, усведамленне ёю непазбежнасці перамогі рабочых раскрывалася артысткай недастаткова выразна. Гэтаму была прычына: захварэла асноўная выканаўца ролі Лугавой, і Лізавеце Парфенаўне давялося яе замяніць. Але справядлівасць патрабуе адзначыць, што пазней роля набыла большую ідэйна-псіхалагічную выразнасць.

У заходняй класіцы Л. Мацісава сустрэлася з вобразамі Лопэ дэ Вега (Марыя — «Дзяўчына са збанам» і Флярэла — «Настаўнік танцаў»). У гэтых сцэнічных вобразах выразна чыталася «вечная тэма»: шчырае і чыстае каханне ўпрыгожвае, ачышчае чалавека. Светлае, крылатае пачуццё перамагала ўсе перашкоды, саслоўныя забабоны, адсталыя феадальныя звычаі і прыносіла маладым людзям свабоду духу і шчасце. Л. Мацісава ў гэтых ролях была вельмі лірычная. Як заўсёды, зграбны і пластычны быў вонкавы малюнак ролі. Ён добра дапаўняўся ўласцівай актрысе музычнасцю, якая выяўлялася тут у дакладнай перадачы інтанацыйнага ладу гаворкі гераінь.

У сучаснай драматургіі Мацісава выступала ў двух планах — сцвярджэння станоўчага пачатку і крытычным кірунку, калі выкрывала хібныя, адмоўныя з'явы ў псіхалогіі, светаадчуванні і паводзінах людзей.

Станоўчыя гераіні Мацісавай звычайна шчырыя, душэўна чыстыя, чулыя, сардэчныя. Ім уласціва жаноцкая прывабнасць. Вось Дзямідава («Жыве на свеце жанчына» З. Аграненкі, рэжысёр І. Папоў) з яе нялёгкім лёсам, радасцямі і трывогамі, пакутамі і паўнатой адчування шчасця. Гэта жанчына прынцыповая і настойлівая, калі абараняе сваё разуменне жыцця. Здольная на глыбокія перажыванні і высакародныя ўчынкі, яна не пазбаўлена і гарэзлівасці, і пачуцця гумару. Лірыка-рамантычная плынь у вобразе (каханне да Лобава) арганічна з'яднана з трагічнымі эмоцыямі (сцэна смерці мужа). Багатая палітра фарбаў з выключнай мастацкай тактоўнасцю выкарыстоўвалася ў гэтай ролі. Былі тут і натхнёная рамантыка, і пяшчотная акварэль.

Паспяхова былі сыграны ролі маладых савецкіх жанчын — Анісавай («Заводскія хлопцы» — сцэна ў хірургічнай клініцы), работніцы, члена Мінскага Савета («Святло з Усходу»), туркменкі Язгюль («Сям'я Алана»), Ціны Карамыш («Бітва ў дарозе») і інш.

Валявыя рысы нямецкай рэвалюцыянеркі, змагара супраць фашызму за новую, сацыялістычную Германію мы бачым у вобразе Луэлы — адной з апошніх работ артысткі («Гарачае лета ў Берліне»). Гэтая роля для Мацісавай мае прынцыповае значэнне. Спектакль сведчыць аб з'яўленні ў артысткі новых інтанацый, больш выразнай грамадзянскай пазіцыі ў трактоўцы вобраза.

Артыстцы давялося таксама выступіць у спектаклі «Такое каханне» П. Кагоута ў ролі Ліды. У гэтым вобразе найбольш поўна раскрыўся лірыка-драматычны тэмперамент Мацісавай. Яна здолела перадаць хвалюючыя пачуцці гераіні, яе душэўныя пакуты, надзеі і расчараванні, веру ў перамогу праўды над крывадушнасцю. Артыстка, як заўсёды, была ў гэтай ролі прывабная, пяшчотная, паэтычная. Мяккая, некрыклівая манера ўвасаблення трагічнага канфлікту гераіні з асяроддзем, са злоснымі, фальшывымі людзьмі ўзбагаціла вобраз Ліды і дапамагла артыстцы знайсці шляхі да сэрца гледача.

Для абмалёўкі ж сатырычных вобразаў, якія ёй апошнім часам даводзіцца ўсё больш іграць, Л. Мацісава шукае і знаходзіць і яркія, каларытныя фарбы. Запомнілася ў яе выкананні душэўна спустошаная, агідная мяшчанка Ніна Леанідаўна («Шчасце» І. Дорскага), бессаромная, пазбаўленая сумлення Нона Адамаўна («Родная маці» М. Алтухова), эксцэнтрычная Паэма («Не называючы прозвішчаў» В. Мінко), надзьмутая ганарлівая лэдзі Кэт («Вострыя Афрадзіты» А. Парніса).

І тут, верная сваёй манеры, артыстка не ўпадае ў павярхоўны гратэск, пазбягае аднастайнасці чорных фарбаў.

Лізавета Парфенаўна Мацісава дасягнула творчай сталасці. Шкада толькі, што апошнім часам рэжысура тэатра імя Якуба Коласа мала аддае ёй увагі, рэдка займае ў спектаклях. Ад гэтага трацяць не толькі артыстка і тэатр, але і мы, гледачы.

Міхась МОДЭЛЬ.

ПАКАЗНОЕ І САПРАЎДНАЕ

Два гады назад загадчыца Клінскага сельскага клуба (калгас «Кастрычнік») Кацярына Лавушчанка прывезла на раённы агляд самадзейнасці свой маладзёжны калектыў. Дзяўчаты выканалі народную песню, якую там-сям спявалі ў раёне і раней, — «Касіў Ясь канюшыну». І дзіва: поўная зала гледачоў, якая абыякава прымала многія мудрагелістыя сучасныя песні, пачуўшы «Ася», выбухнула авацыямі. І песня пайшла ў жыццё. З Дома культуры людзі панеслі яе ў свае хаты. Клінскі жаночы ансамбль з гэтым сваім нумарам выступаў у Магілёве, Мінску. Нарэшце, хор запрасілі ў Маскву. Цяпер пра Ася спяваюць у кожнай хаце Касцюкоўшчыны.

Чаму песня пасля выступлення ансамбля набыла такую шырокую вядомасць? Яе ж чулі і раней. Відаць, выканаўцы адкрылі ў ёй нейкія новыя рысы і ўсхвалявана перадалі іх слухачам.

Другая песня, народжаная ў нас,— «Касцюковіцкі вальс» — таксама заваявала сабе прыхільнікаў. Гэта гаворыць аб тым, што на Касцюкоўшчыне могуць і выконваць і нават ствараць добрыя творы.

Вялікай папулярнасцю карыстаецца ў раёне Беладубраўскі жаночы саўгасны хор. Вёска з паэтычнай назвай — Белая Дуброва — размешчана на высокім беразе Беседзі. Насупраць яе — заліўны луг, а далей бясконцы прастор зялёнага бору. Гэты маляўнічы куток Беларусі быццам мае песенныя крыніцы. У Белай Дуброве даўно жыве і працуе надзвычай цікавы чалавек — настаўніца Ганна Сямёнаўна Глазоўская. Яна арганізатар і душа харавога калектыву.

Шмат год назад сталі вядомымі ў раёне «Беладубраўскія вечары». Пачаліся яны ад свята 8 Сакавіка. У адзін са святочных вечароў жанчыны наладзілі канцэрт, і гэта стала традыцыяй. На дапамогу калектыву прыйшлі дырэктар Касцюковіцкай музычнай школы Міхал Жмейда і выкладчыца гэтай школы Лідзія Заяц. У рэпертуар уключылі беларускія народныя песні «А ў полі вярба» і «Чачотачка». Паслухаўшы іх выступленне, народны артыст СССР Рыгор Раманавіч Шырма сказаў:

— Песня «А ў полі вярба» нібы нарадзілася ў калектыве другі раз.

Поспехам звычайна карыстаюцца і творы з мясцовага жыцця. Але да напісання іх трэба смялей прыцягваць членаў літаб'яднання. Творчая садружнасць дала ўжо неблагі плён. Прыклад гэтага — песня «Забычанская лірычная», якую выконвае Беладубраўскі хор. Словы яе напісаў дырэктар саўгаса Ул. Левановіч, музыка кіраўніка хору М. Жмейды.

У Касцюковічах была створана сюіта «Касцюковіцкія вечары». Шкада, што яна ў першы год жыцця загублена няўмелым выкананнем. Такі ж лёс напаткаў песню з жыцця саўгаса — «А ў нас у Бароньках», частушкі працаўніц быткамбіната і інш. На жаль, цяпер раённы аддзел культуры чамусьці абыходзіць наша літаратурнае аб'яднанне.

Цяпер паглядзім, што робіцца ў іншых калектывах раёна. Зазірнуўшы ў справаздачы аддзела культуры, прыходзіш да думкі, што справы нядрэнныя. У раёне 16 агітбрыгад, дадзена вялікая колькасць канцэртаў. І тым не менш у Касцюковічах самадзейнасць пайшла на спад.

Я звярнуўся да некаторых кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. На маё пытанне: «Ці ёсць на вашым прадпрыемстве калектыў мастацкай самадзейнасці?» — дырэктар льнозавода Анатоль Іосіфавіч Клінцэвіч так і адказаў:

— Толькі лічыцца, што ёсць.

Працаўнікі льнозавода штогод робяць спробы арганізаваць самадзейны калектыў і па дапамогу звяртаюцца ў аддзел культуры. Просьбу пачулі, прыслалі неяк баяніста. Ён разоў колькі прыйшоў, паіграў ды кінуў, рэпетыцыі на тым і спыніліся.

— У нашай сістэме ў горадзе працуюць не менш 400 чалавек, — гаворыць старшыня райспажыўсаюза З. Портнік, — і амаль палавіна з іх моладзь. Ёсць спевакі, танцоры, дэкламатары. Нам бы памагчы хоць на першым часе...

Няма ў Касцюковічах калектываў самадзейнасці сярод медыцынскіх работнікаў, настаўнікаў, рабочых аўтабазы, міжкалгасбуда, аб'яднання «Сельгастэхніка». Рабілася спроба стварыць сёлета агульнагарадскі хор, але і з гэтага нічога не атрымалася.

Вядома, у раённым аддзеле культуры справядліва скардзяцца на недахоп кваліфікаваных культработнікаў. З магілёўскага культасветнага і музычнага вучылішчаў сапраўды мала прысылаюць выпускнікоў. Але праўда і тое, што ў Касцюковічах не імкнуцца берагчы кадры. Папрацуе нейкі час малады выпускнік і «па ўласнаму жаданню» пакідае раён. Мо таму ў раённым Доме культуры цяпер няма баяніста, як не кожны месяц мяняюцца інструктары.

Даўно ў нас мінуў час паказухі. На жаль, у самадзейным мастацтве яна ў поўным росквіце. Як у нас звычайна бывае? Актыўная падрыхтоўка пачынаецца, як правіла, незадоўга перад дэкадай, аглядам ці фестывалем. І, каб нешта паказаць у абласным цэнтры, рыхтуюць адзін-два калектывы. Вось, маўляў, як мы можам! І ў нас усе такія!..

У Касцюковіцкім раёне былі два такія калектывы. Калгас «Кастрычнік» з Клінскім ансамблем нядаўна перайшоў у Хоцімскі раён. Засталася адна Белая Дуброва. Астатнія ж нашы здольныя артысты самадзейнай сцэны чакаюць дапамогі. Чакаюць і ніяк не дачакаюцца.

Галоўнае — «абы ціха».

С. ПАЦЁМКІН,
старшыня раённага літаратурнага аб'яднання.
г. Касцюковічы.

МАЛЮНКІ РОДНЫХ ПРАСТОРАЎ

Мароз. Застылі ў нерухомасці маладыя сасонні. А беластвольныя прыгажуні-бярозкі выскачылі на ўскраек лесу і нібы любуюцца навакольнай прыгажосцю.

Углядаюся ў гэту карціну і здаецца, што падобнае недзе бачыў. Так яно і ёсць. Непадалёку ад вёскі Пачапоў больш дзесяці гадоў назад хлебаробы калгаса «Камінтэрн» пасадзілі лес. Адным з ініцыятараў быў загадчык сельскага клуба Аляксандр Паплына. Мінаюць гады. Лес расце, набіраецца сілы, весела цягнуцца да сонца маладыя яліны і сосны.

Часцінка гэтай прыгажосці роднага краю занатавана ў пейзажы вясковага мастака Аляксандра Паплыні.

Яго дом нагадвае карцінную галерэю. На сценах—карціны, і ўсе яны апяваюць непаўторную прыгажосць тутэйшых мясцін, працавітых людзей калгаса.

Загадчык клуба часта бывае ў полі, на таку, на фермах. Чытае газеты, праводзіць гутаркі, выпускае «балявыя лістні», «маланкі» і заўсёды прыглядаецца, як працуюць яго аднавяскоўцы. З гэтых назіранняў нарадзілася карціна «На таку» і многія іншыя яго работы.

Творы А. Паплыні неаднаразова экспанаваліся на раённых і абласных выстаўках народнага мастацтва.

Ёсць у Аляксандра Васільевіча адна даўняя задума—прысвяціць свой новы твор маладым калгаснікам. Над ёю мастак цяпер і працуе.

С. СЯМЕНАЎ.
Краснапольскі раён.

ВЫСТАЎКА САМАДЗЕЙНЫХ МАСТАКОЎ

Як і ўсюды ў нашай рэспубліцы, народныя ўмельцы Кобрыншчыны ўключаюцца ў фестываль самадзейнага мастацтва. Цяпер у чытальнай зале гарадскога парку імя Суворава адкрыта выстаўка твораў народных умельцаў. Хатняя гаспадыня М. Кірыёнчык вышыла пано з партрэтам Ул. І. Леніна. Цікавая работа і другой вышывальшчыцы Е. Рубан—«Раніца ў Крыме». З твораў жывапісу запамінаюцца карціны самадзейнага мастака В. Ахрамкова «Сакавіцкі вечар», «Будаўніцтва швейнай фабрыкі», «На вуліцы Леніна».

Д. ШОСТАК.

ГАСТРОЛЬНЫЯ ПАЕЗДКІ

Нядаўна ў гастрольную паездку па гарадах і сёлах Савецкай Украіны накіравалася вялікая група артыстаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Эстрадна - маладзёжны ансамбль «Мелодыі і рытм» з удзелам Віктара Сінайскага будзе даваць канцэрты ў Кіраваградскай, Ровенскай, Жытомірскай, Вінніцкай, Хмяльніцкай, Луганскай, Данецкай і Днепрапятроўскай абласцях. Выступленні беларускіх артыстаў працягнуцца каля двух месяцаў.

З канцэртнай брыгадай пад кіраўніцтвам спевака Эдуарда Міцуля выехаў жаночы вакальны квартэт «Нарачанка» ў складзе Л. Паддавашкінай, Н. Фядулінай, Н. Бернасевіч і Е. Кісялёвай. За два месяцы артысты пабываюць з канцэртамі ў Луганскай, Кіраваградскай і Запарожскай абласцях.

У Хмяльніцкім, Цярнопалі, Чарнаўцах, Іванава-Франкоўскім, Ужгарадзе, Львове, Луцку, Роўна і ў многіх іншых гарадах выступіць эстрадны калектыў пад кіраўніцтвам Ганны Ражковай.

Паспяхова праходзяць канцэрты эстраднага калектыву пры ўдзеле Вівена Разенека, які пераехаў нядаўна з Жытомірскай у Кіеўскую вобласць.

Цікавыя падарожжы па гарадах і сёлах Расійскай Федэрацыі робіць эстрадна-маладзёжны ансамбль пад кіраўніцтвам і пры ўдзеле заслужанага артыста Беларускай ССР Рыгора Дзідзенкі. З ансамблем выступаюць такія папулярныя артысты, як вакальнае трыо сясцёр Логінавых і майстры спорту СССР Анатоль Ржэвускі і Ігар Пігулеўскі.

Я. МАЛЫ.

Аляксандр МІРОНАЎ



Нейзабаве ў выдавецтве «Беларусь» выходзіць з друку мой зборнік нарысаў «Залічаны навечна», прысвечаны выдатнікам службы аховы грамадскага парадку нашай рэспублікі. У зборніку сабраны нарысы пра лепшых людзей нашай міліцыі.

Адзін з нарысаў, што ўвайшлі ў кнігу, прапаную ўвазе чытачоў.

АЎТАР.

Недаверлівую іронію новых сваіх таварышаў Іван Данілавіч Зянькоў адчуў ужо з першых дзён работы. Не, ніхто з іх не падкрэсліваў гэтую іронію, не выказваў яе адкрыта. Наадварот, прынялі Зянькова цёпла, як заўсёды прымаюць у міліцыі новых работнікаў. Прызначылі старшым інспектарам, адвялі памяшканне для крыміналістычнага кабінета, з жыллём памаглі ўладкавацца даволі хутка, але...

Але за ўсім гэтым адчувалася: «А што, уласна кажучы, могуць нам даць усе твае спецыяльныя веды? Ці будзе ад іх канкрэтная карысць нашай агульнай справе?» Уголас гэтага, вядома, ніхто не гаварыў. Але думалі так многія.

Іван Данілавіч не крыўдаваў на таварышаў. Тым больш, што і сам не быў упэўнены ў хуткіх, а тым больш бліскучых поспехах у новай рабоце. Адна справа — следчая служба, або аператыўная: там усё адстаялася, склалася, і там гадамі накоплены вопыт. Не ведаеш чаго-небудзь — папытай у таварыша, ён заўсёды паможа. І зусім іншая — крыміналістыка, якую маладому спецыялісту Івану Зянькову трэба будзе ўпершыню ў гісторыі міліцыі горада Віцебска і стварыць, і арганізаваць, і па-сапраўднаму глыбока ўкараніць у штодзённую міліцэйскую службу.

Праўда, за плячыма ў Івана Данілавіча гады вучобы — спачатку ў Мінску, потым у Маскве на факультэце крыміналістыкі спецыяльнай навучальнай установы. Не толькі падрабязна запісаны ў канспектах, але і трывала занатаваны ў памяці лекцыі палкоўніка міліцыі Хананіна па судовай хіміі, кандыдата юрыдычных навук Камарынца па крыміналістычнай экспертызе дакументаў, вучонага Кубіцкага па судовай балістыцы. У багажы Зянькова трывалыя веды, практычны вопыт, накоплены ў час разнастайнай і шматмесячнай практыкі ў сталіцы. Але ці хопіць гэтых ведаў і гэтага вопыту для таго, каб цяпер самастойна весці навуковую крыміналістычную работу?

Зрэшты, пачынаць яе, гэтую работу, давялося не адразу. Спачатку навалілася процьма самых неадкладных, штодзённых спраў і клопатаў, ад якіх, як ні круціся, не выкруцішся. Трэба было і навуковую апаратуру здабыць, і неабходнае на першы час абсталяванне збіраць, як той казаў, па каліву. Сталы для крыміналістычнага кабінета — і тыя Зянькову давялося рабіць самому. Не дзіва, што Іван Данілавіч, не-не, ды і лавіў на сабе іранічныя позіркі таварышаў па працы.

Але ўсе гэтыя клопаты раптам адляцелі ўбок, як толькі паступіла першая справа. У адным з гарадскіх магазінаў работнікі міліцыі выявілі кражу тавараў і сабралі дакументы, якія пацвярджалі, што кражай доўгі час займалася загадчыца магазіна. Аднак западозраная катэгарычна адмаўляла абвінавачанне, сцвярджаючы, што на дакументах нечай злачыннай рукой падроблены яе подпіс. Так гэта ці не, магла ўстанавіць толькі крыміналістычная экспертыза. Вось яе і даручылі зрабіць Івану Данілавічу Зянькову.

З заданнем ён справіўся без асаблівай цяжкасці, і хутка пераканаўся, што подпісы на дакументах непадробленыя. Аднак западазроная ўсё настойвала на сваім. Завагаўся і следчы: ці не памыляецца малады эксперт? І, каб разам пакончыць з усімі гэтымі сумненнямі і ваганнямі, Зянькоў сам прапанаваў адправіць дакументы на паўторную экспертызу ў Маскву.

Усё аказалася так, як ён сцвярджаў: подпіс не падроблены, а сапраўдны. І давялося злачынцы даваць паказанні аб тым, «як яна дайшла да жыцця такога»...

Сёй-той схільны быў лічыць гэты выпадак шчаслівай удачай маладога крыміналіста. Маўляў, не памыліўся, і добра, а мог бы і памыліцца. Маскоўскія спецыялісты — людзі надзейныя, не тое, што свой. Але калі праз некаторы час, дзякуючы стараннасці і ўвазе гэтага «свайго», удалося прадухіліць пакаранне ні ў чым не вінаватага сумленнага чалавека, адносіны таварышаў да Зянькова карэнным чынам змяніліся ў самы лепшы для яго бок.

Здарылася так, што з раённага цэнтра ў Віцебск даставілі дзяўчыну-прадаўшчыцу, якая абакрала магазін. Разам з ёю прывезлі і рэчавыя доказы зробленага ёю злачынства: перакладзіну ад аканіцы акна, праз якое зладзейка ноччу ўлезла ў магазін, і нажніцы, якімі яна гэтую аканіцу адчыніла. Нажніцы забралі ў час вобыску на кватэры ў прадаўшчыцы, а на планцы-перакладзіне і сляды можа бачыць драпіны і зазубрыны, пакінутыя імі. Адным словам — прызнавайся, і ўсё!

Але ў тым і справа: дзяўчына, не зважаючы на «неабвержныя» доказы, не прызнавалася ні ў чым. А пакуль следства не закончана, пакуль пэўна не даказана, што магазін абакрала іменна яна, ніводзін суд не мае права яе судзіць. Вось і даручылі Івану Данілавічу, на падставе навуковых крыміналістычных дадзеных, даказаць, што ўсе выкручванні зладзейкі марныя.

«Падвёў» Зянькоў свайго ж таварыша — следчага, яшчэ як «падвёў»: самымі навуковымі, самымі неабвержнымі крыміналістычнымі даследаваннямі даказаў, што дзяўчына-прадаўшчыца не мае да крадзяжу ў магазіне ніякага, хоць бы далёкага дачынення. Нажніцы, праўда, належаць ёй, на планцы-перакладзіне ад аканіцы засталіся зазубрыны не ад гэтых нажніц, а ад сякеркі, і адрывалі перакладзіну не слабыя дзявочыя, а моцныя і прытым вопытныя мужчынскія рукі. І хаця дзяўчыну, папярэдне папрасіўшы прабачэння, давялося адпусціць, следчы не быў у крыўдзе на крыміналіста: той і памылку памог папярэдзіць, і скіраваў усё далейшае следства на адзіна правільны шлях.

Вось калі, нарэшце, бясследна рассеяўся нядаўні іранічны недавер сяго-таго з супрацоўнікаў міліцыі да «свайго» крыміналіста! Якая там, к чорту, іронія, калі ён, як кажуць, на кароткай назе, запянбрата з самымі малапрыкметнымі, а часта і зусім нябачнымі для недасведчанага вока «сведкамі» — рэчавымі доказамі зробленых злачынстваў! Калі возьмецца за справу — ніводнай дробязі не прапусціць. А з такіх дробязей і складаецца ўвесь ход клапатлівага следства, ад вынікаў якога залежыць лёс чалавека, што знаходзіцца пад следствам.

У ходзе следства не павінна быць ніводнай, нават самай меншай памылкі, ні кроплі адступлення ад ісціны, ад дакументальнасці, ні намёку на домысел, фантазію следчага. Следчы можа выстаўляць колькі хочаш версій, будаваць незлічонае мноства меркаванняў. Без гэтага не абысціся, не ўявіць сабе, хаця б прыблізна, як чалавек ішоў да злачынства і як зрабіў яго. Але якую б версію ні выстаўляў следчы, што б ён ні думаў, ён не проста павінен, а па савецкіх законах абавязаны даказаць — фактамі, дакументамі, паказаннямі сведак і ўсімі іншымі матэрыяламі доказаў віноўнасць абвінавачваемага. Іменна **даказаць**, бо без доказаў чалавек не можа з'яўляцца і не з'яўляецца злачынцам перад законам. Бывае так, што з нейкіх меркаванняў невінаваты чалавек бярэ на сябе ўвесь цяжар віны і адказнасці за зробленае некім іншым злачынства. Здараецца, што вопытныя злачынцы ўзвальваюць адказнасць на невінаватага, які няздольны або не ўмее даказаць сваё алібі. Нарэшце, таксама бывае, праўда, рэдка, калі спрактыкаваны нягоднік, замятаючы сляды, ахвотна прызнаецца ў нязначным злачынстве дзеля таго, каб тым самым унікнуць адказнасці за злачынства вялікае. Бывае! І ў тым і заключаецца важнейшы і свяшчэнны абавязак следчага, што ён павінен асцярожна і цярпліва раскрываць пласт за пластом, што хаваюць ісціну, да таго часу, пакуль ісціна гэтая не стане перад правасуддзем ва ўсёй сваёй неабвержнасці.

А памочнікам для следчага скрозь і ўсюды можа быць толькі вучоны-крыміналіст, які пастаянна мае справу з нямымі сведкамі, што абавязкова застаюцца на месцы кожнага злачынства.

Ці шмат часу патрэбна, каб, прыгразіўшы пісталетам адзінаму прадаўцу, выхапіць з касы сельскага магазіна дзённую выручку і адразу ж уцячы на матацыкле? Дзве, максімум тры мінуты... Няхай нават прадавец заўважыць колер або марку машыны. Няхай запомніць, што не заўсёды верагодна, у што былі апрануты рабаўнік і шафёр-матацыклісты. Усё роўна, пакуль ён дабяжыць

З НАРОДНЫХ КРЫНІЦ

У ЗАПАСНІКАХ МУЗЕЯ ЭТНАГРАФІІ НАРОДАЎ СССР

Гэтым летам група студэнтаў гуртка аматараў беларускага мастацтва Тэатральна-мастацкага інстытута арганізавала дзве экспедыцыі для пошукаў узораў беларускага народнага і тэатральнага мастацтва. Адна з груп, будучыя акцёры, паехала ў Маскву ў Дзяржаўны тэатральны музей імя Бахрушына, дзе знаходзіцца ўнікальны помнік беларускага тэатральнага мастацтва XVIII стагоддзя — «Ельненская батлейка». Студэнты зрабілі фотаздымкі батлейкі і дзеючых асоб, пазнаёміліся з першымі батлеечнымі народнымі тэкстамі.

Другая група, будучыя мастакі, пад кіраўніцтвам Л. Баразны паехала ў Ленінград вывучаць беларускія фонды Музея этнаграфіі народаў СССР, Пастаяннай выстаўкі музычных інструментаў, калекцыі іншых музеяў.

У Ленінградзе мы не абмяжоўваліся толькі зборам этнаграфічных матэрыялаў у вядомых нам музеях і выстаўках, але і шукалі новыя. Некаторыя з нас працавалі ў бібліятэках, вывучалі матэрыялы, звязаныя з гісторыяй беларускага мастацтва першых паслярэвалюцыйных год, надзвычай цікавай і малавывучанай.

З этнаграфічных калекцый нас больш за ўсё цікавілі касцюмы. Справа ў тым, што у нас амаль няма грунтоўных дапаможнікаў па беларускаму нацыянальнаму касцюму. За ўсе пасляваенныя гады не было выдадзена ніводнага спецыяльнага альбома такога профілю. Праўда, у зборніках «Беларускае народнае мастацтва» (1951 г.) і «Народнае і прыкладное мастацтва Савецкай Беларусі» (1958 г.) ёсць малюнкі касцюмаў, аднак іх вельмі мала, а каляровыя можна пералічыць на пальцах. Прычым прадстаўлена адзенне толькі цэнтральных і паўднёвых раёнаў рэспублікі. З галаўных убораў ёсць толькі некалькі намітак, а верхняга адзення—ні мужчынскага, ні жаночага — наогул няма. Трэба дадаць, што тыраж даволі цікавага першага зборніка «Беларускае народнае мастацтва» ўсяго 1000 экземпляраў, цяпер гэты зборнік стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. Немагчыма знайсці старадаўні беларускі касцюм. Я маю на ўвазе не толькі сялянскі, але і касцюм шляхты і іншых слаёў насельніцтва. Таму мастакам цяжка працаваць над кампазіцыямі на нацыянальныя тэмы, ілюстраваць мастацкую літаратуру. Патрэбны ўзоры такога адзення і танцавальным ансамблям, эстрадзе, мастакам, якія ствараюць сувеніры. Нам, студэнтам, таксама вельмі патрэбны матэрыялы па этнаграфіі. Вось чаму мы так актыўна пачалі пошукі.

У музеі этнаграфіі мы знайшлі касцюмы, керамічныя цацкі, керамічны і драўляны посуд, музычныя інструменты і іншыя рэчы, што сабралі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя вядомыя беларускія этнографы Раманаў, Сержпутоўскі і іншыя.

Перад намі былі выдатныя ўзоры народнага адзення, багатыя не толькі колерам, але і з вялікай выдумкай фасону, элегантным сілуэтам. Сярод іх аказалася многа касцюмаў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай абласцей. За невялікі час мы замалявалі каля 20 касцюмаў. Асобна падавалі іх саставныя часткі — кашулі, андаракі, кабаты, фартухі, паясы і галаўныя ўборы. Вялікую ўвагу мы звярнулі на гарсэты, якія адыгрываюць у ансамблі касцюма прынцыповую ролю. Нас уразіла іх разнастайнасць. Гарсэты былі розных колераў — ад чорна-сіняга да жоўта-серабрыстага, розных канструкцый, зробленыя з розных па фактуры і па малюнку тканін. Многія з іх былі арнаментаваны залатымі, рознакаляровымі пазументамі. Некалькі гарсэтаў, тканых залатой ніткай, якія раней выпадкова адносілі да літоўскага касцюма, аказаліся слуцкай работы. (У кожнай рэчы ёсць «пашпарт», дзе запісаны вобласць, павет, вёска, год, у якім яна набыта).

Прывезлі замалёўкі галаўных убораў. Сярод іх адзін вельмі цікавы — залатая карона, упрыгожаная папяровымі кветкамі, а ззаду яе знаходзіцца багата вышытая намітка і каляровыя стужкі. На думку спецыялістаў, гэта тыповы беларускі галаўны ўбор. Нічога падобнага не было ні ва ўкраінцаў, ні ў палякаў, хаця асобныя дэталі з яго і паўтараюцца.

У музеі захоўваецца найбагацейшая калекцыя беларускай набойкі для вырабу тканін з набіванкай. Мы замалявалі ўсе 70 экземпляраў.

Тут мы ўбачылі і вельмі цікавыя керамічныя рэчы—цудоўныя цацкі-свістулькі — паліваныя і фарбаваныя, арыгінальныя як па сваіх формах, так і па дэкору. Нам здаецца, яны не саступаюць вядомай дымкаўскай цаццы, застаючыся глыбока самабытнымі, нацыянальнымі. З традыцыйнага керамічнага посуду вылучаецца кашпо (1914 г.), на дзіва сучаснае па форме. Замалявалі мы і традыцыйныя музычныя беларускія інструменты — ліру, гуслі, бубен, жалейку, унікальную свістульку-бразготку.

Замералі і дакладна замалявалі вядомую магілёўскую батлейку з дванаццаццю лялькамі.

Зацікавілі нас і драўляныя прадметы побыту.

Усе гэтыя замалёўкі былі прывезены ў Мінск і выстаўлены ў памяшканні Тэатральна-мастацкага інстытута. Выстаўка выклікала вялікую цікавасць у студэнтаў, выкладчыкаў і мастакоў горада.

У нас ёсць яшчэ адна цікавая задума. Пад кіраўніцтвам майстра-кераміста Ф. Зільберта мы хочам паўтарыць усе ўзоры гліняных цацак і прапанаваць Мастацкаму фонду выпускаць іх у якасці сувеніраў. Думаем таксама зрабіць копію і магілёўскай батлейкі разам з лялькамі. Гэтую батлейку можна было б выкарыстаць і для таго, каб разыгрываць сатырычныя сцэнкі з сучаснага жыцця. Наогул добра было б стварыць пры інстытуце музей беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У заключэнне хочацца падзякаваць супрацоўнікам Музея этнаграфіі народаў СССР, якія ветліва нас сустрэлі і дапамаглі ў рабоце.

Генадзь САКАЛОЎ,
студэнт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.





Прапануем вашай увазе некалькі замалёвак, што зрабілі студэнты Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута ў Музеі этнаграфіі народаў СССР. Узоры беларускага нацыянальнага адзення пачатку нашага стагоддзя і персанаж з магілёўскай батлейкі (малюнкі зверху ўніз). Драўляныя карцы са Слуцкага і Барысаўскага паветаў і гліняная цацка з Магілёўскай і Віцебскай губерняў (малюнкі ўнізе).

Трыццаць роляў аўтазаводца Яфімава

Было гэта даўно, амаль сорак год назад. Самадзейныя артысты 2-га гадзіннікавага Маскоўскага завода ставілі спектакль «Захарава смерць». Спектакль пра новую вёску, пра змены, што адбыліся ў ёй пасля Вялікага Кастрычніка.

«Не хоча мірыцца з новым жыццём кулак Захар, сквапнік і дэспат, заўзяты вораг Савецкай улады. Выканаўца гэтай ролі іграў асабліва добра. А калі апусцілася заслона, на сцэну выйшаў старшыня заўкома. Ён павіншаваў артыстаў з поспехам і спытаў:

— Бачу, спектакль вам спадабаўся. А новы ставіць будзем?

— Чаму ж не, — азваўся з першага рада стары каваль І. Петухоў. — Толькі трэба, каб нашы заводскія хлопцы іграли, а то ж кулака хто іграў? Сапраўдны артыст.

Усміхнуўся старшыня заўкома, падштурхнуў да рампы «артыста».

— Ну, пакажыся.

Зняў той парык, вусы і бараду разам з носам. І. Петухоў ахнуў:

— Ды гэта ж Рыгорка. Рыгорка Яфімаў...

Франтавымі дарогамі ішоў у ваенныя гады Рыгор Іванавіч Яфімаў. Пасля заканчэння вайны прыехаў у Мінск. У студзені 1948 года прыйшоў у аддзел кадраў аўтамабільнага завода.

Калі афішы паведамілі, што пры заводскім Доме культуры ствараецца драматычны калектыў, на першыя рэпетыцыі прыйшоў і Рыгор Іванавіч.

Развучвалі спачатку інсцэніроўкі. Праз некаторы час паставілі спектакль Б. Гарбатава «Юнацтва бацькоў». Вядучую ролю камандзіра часці палкоўніка Рабініна даручылі Рыгору Іванавічу. І не памыліліся. Гэта адзначылі і аўтазаводцы, і гледачы ў Маскве, куды тэатральны калектыў Дома культуры выязджаў са спектаклем.

Ішоў час. Рос тэатральны калектыў. Расло і майстэрства яго ўдзельнікаў і, у прыватнасці, Рыгора Яфімава.

Амаль ва ўсіх спектаклях яму даручаюць вядучыя ролі. Гэта і Ягор Булычоў з аднайменнай п'есы М. Горкага, і Гадун з «Разлому», і камандзір атрада са спектакля «Выбух», і Платон Крэчат.

Некалькі год назад калектыву прысвоілі званне народнага тэатра. А Рыгор Іванавіч Яфімаў стаў у ім вядучым артыстам.

Рыгор Іванавіч сыграў больш за трыццаць роляў. І ў кожную ён уклаў частачку сваёй душы, у кожнай праявіўся ягo талент перавасаблення. Разам з калектывам народнага тэатра ён рыхтуецца цяпер да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва. У п'есе А. Маўзона «У бітве вялікай» яму даручана роля начальніка ЧК. І зноў спяшаецца вечарамі майстар аўтапрычэпнага ў заводскі Дом культуры. Яму ёсць што сказаць людзям, а для акцёра гэта самае галоўнае.

С. ГЕБЕЛЕВА.

«СЛУЖЫМ ЁЙ ШТОДЗЕНЬ ДАБРОМ...»

Пра першую кніжку пісьменніка

ГЭТЫ год вельмі ўрадлівы на паэзію, асабліва на маладую. З друку адзін за адным выходзяць першыя зборнікі вершаў—А. Сербантовіча, А. Маляўкі, В. Зуёнка, А. Канапелькі. І вось яшчэ адна паэтычная заяўка — кніжка Міколы Кусянкова «Жывіца», якую адрэдагаваў на грамадскіх асновах Мікола Аўрамчык.

Вельмі радуе, што кніжка гэтая мае свой твар. У Кусянкова свая тэма, вельмі важная і мала распрацаваная ў нашай (і не толькі маладой) беларускай паэзіі — рабочая тэма. Пры тым яна невыпадковая ў творчасці М. Кусянкова. Малады паэт закончыў лесатэхнікум, працуе лесаўпарадчыкам, знаходзіцца, як часта любяць пісаць у газетах, у гушчы працоўнага жыцця. Ён ведае цану поту, ведае блізка простых рабочых людзей. А з другога боку, работа ўвесь час сутыкае М. Кусянкова з прыродай, з лесам, дае магчымасць яму добра разумець «мову» дубоў і сосен, іх «душу».

«Любоўю да зямлі сваёй адною жывём і служым ёй штодзень дабром» — гэтыя радкі з верша «Навальніца» маглі б стаць эпіграфам да ўсяго зборніка. Служыць Радзіме дабром, кожны дзень працаваць на яе карысць —гэтай думкай, гэтым імкненнем дыхаюць многія творы М. Кусянкова. У вершы «Хлеб у дарогу» ён, напрыклад, проста і паэтычна гаворыць, што без хлеба, вырашчанага рукамі калгаснікаў, машыністу не павесці цягнік, геолагу не пайсці ў паход, вучонаму не закончыць свайго даследавання; у вершы «На новы час» падкрэслівае высокую свядомасць людзей працы, іх маральную чысціню.

Натруджаны, урачыста
Ідзеш ты белай зямлёй. —
І ўвесь ты душою чысты,
Як першы снег,
перад ёй.
(«Першы снег»).

Малады паэт ненавязчыва зазначае, што праца чалавечая звязвае дружбаю кантыненты і краіны. Яго герой, рабочы шклозавода (верш «З-пад Гомеля — чулі вы, мабыць, пра гэта...») мае падставу ганарыцца тым, што плён яго рук дайшоў аж да брата-кубінца. «Чыстае шкло з празрыстасцю рос беларускага лета» перарастае тут у сімвал вялікай дружбы паміж беларускім і кубінскім народамі...

Цэлы раздзел зборніка прысвечаны людзям рамантычнай прафесіі — геолагам, разведчыкам тайгі. Паэт піша пра іх з замілаваннем, з павагай да іх нялёгкіх будняў. Ён умее вельмі хораша, проста і даверліва расказаць і аб тым, што «не мякка рамантыка сцеле», і аб тым, як гэта гераічна і няпроста ісці дарогамі першапраходцаў. Раздзел гэты атрымаўся цэласным, шчырым і па-сапраўднаму паэтычным.

Прываблівае і вершы М. Кусянкова аб роднай прыродзе. «Мне краявід маёй Айчыны да болю ў сэрцы дарагі» — прызнаецца паэт. Родную прыроду ён любіць перш за ўсё за яе сціпласць і мужнасць. Звяртаючыся да лесу, ён заяўляе: «Табе б таксама прышпіліць медалі на кожную сасну, на кожны клён».

Прырода для М. Кусянкова ніколі не бывае нежывой, глухой і раўнадушнай. У яго сасна, якой у жыцці ўжо нямала прыйшлося пабачыць,

Сябрам... ўдзень і ўночы
Дарогу на ўсход пакажа:
А ворага толькі ўсочыць —
Упоперак шляху ляжа.
(«Сасна»).

Вершы маладога паэта нешматслоўныя, шчырыя і стрыманыя. Яны гучаць як прызнанне ў любві да людзей працы, да роднай зямлі, а любоў не патрабуе гучных слоў. Таму радкі ў М. Кусянкова сціплыя, простыя. Няма тут ніякіх «штукарстваў», непатрэбных упрыгожванняў.

«Жывіца» — першая кніжка паэта. І гэта часамі адчуваецца, адчуваецца, што аўтар вучыцца ў старэйшых беларускіх і рускіх савецкіх паэтаў. У вершы «Завея. Вёска спіць. Адно...», напрыклад, відаць творчая вучоба ў М. Ісакоўскага. А ў вершы «Дарога на Байкал» і інтанацыі, і рытм, нават лексіка нагадваюць некаторыя старонкі з вядомай паэмы А. Твардоўскага «За даллю—даль».

Хацелася б на будучае пажадаць маладому паэту і большай смеласці ў пошуках новага, і большай грамадзянскай страснасці. Гэта зробіць яго творчасць і больш глыбокай, і больш важкай...

Мікола Кусянкоў шукае сваіх сцежак у паэзіі. І шукае іх паспяхова. Лепшыя вершы зборніка пераканаўча сведчаць аб гэтым. Хай жа пошукі працягваюцца, хай поспехі множацца!..

Ц. ЛІЯКУМОВІЧ.

г. Бабруйск.

М. Кусянкоў. «Жывіца». Вершы. Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1966.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Беларуская народная казка. «Два марозы». На рускай мове. Мастак І. Някрасаў. 1966 г. Тыраж 200.000 экз., 16 стар. Цана 16 кап.

П. Вікторчык. Над Ольсай-рэкой. Партызанскія запіскі. На рускай мове. Літаратурны запіс А. Коласава. Мастак Ю. Архіпаў. 1966 г. Тыраж 30.000 экз., 144 стар. Цана 23 кап.

С. Грабеншчыкаў. Беларускія танцы. Мастацкай самадзейнасці. На рускай мове. Мастак С. Кавалёў. 1966 г. Тыраж 5.500 экз., 64 стар. Цана 19 кап.

Янка Журба. Ластаўкі. Вершы для дзяцей. Мастак Г. Паплаўскі. 1966 г. Тыраж 23.000 экз. Цана 23 кап.

Уладзімір Карпаў. Крылаты ўзлёт. Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мастак Л. Прагін. 1966 г. Тыраж 4.500 экз., 360 стар. Цана 1 руб. 16 кап.

Кандрат Крапіва. Сорак бабек. Мастак А. Волкаў. 1966 г. Тыраж 16.000 экз., 144 стар. Цана 58 кап.

Іван Пташнікаў. Сцяпан Жыхар са Сцешыц. Апавяданні. Мастак Н. Шчасная. 1966 г. Тыраж 7.000 экз., 200 стар. Цана 36 кап.

Яны не сталі на калені. Зборнік успамінаў і дакументаў аб канцлагеры Бяроза Картуская. На рускай мове. Мастак Ю. Архіпаў. 1966 г. Тыраж 20.000 экз., 348 стар. Цана 81 кап.

Канстанцін Цітоў. Ручаёк. Выбраныя вершы. На рускай мове. Мастак В. Басалыга. 1966 г. Тыраж 7.000 экз., 160 стар. Цана 41 кап.

Нічыпар Чарнушэвіч. Гаворка дум. Вершы. Мастак Л. Чурко. 1966 г. Тыраж 4.000 экз. Цана 16 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»

Г. Макеева, П. Мядзведзеў. Апавяданні пра фізікаў. На рускай мове. Мастак М. Ганчароў. 1966 г. Тыраж 35.000 экз., 379 стар. Цана 61 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

Е. Кулікава. Вечары займальнай хіміі. На рускай мове. 1966 г. Тыраж 35.800 экз., 182 стар. Цана 40 кап.

ЗАЎВАГІ НА ПАЛЯХ

І КРЫЛЫ МУЗЫКІ БЯССІЛЬНЫ

Вось жа былі раней людзі, якія ўсур'ёз лічылі, што з песні слова не выкінеш. Прытым так былі ў гэтым пераконаны і ўпэўнены, што ідуць стагоддзі, мяняюцца пакаленні, а ў зборніках народнай мудрасці з году ў год друкуюць іх выслоўе: «З песні слова не выкінеш». Праўда, нават у каментарыях не сказана, мелі яны на ўвазе ўсе песні ці толькі некаторыя. Ва ўсякім выпадку, я б'юся аб заклад з кім хочаш, што з песнямі, падобнымі да напісаных на тэксты І. Панкевіча, яны, тыя нашы разумныя продкі, знаёмы не былі. Пашанцавала ім—а то былі б кнігі прыказак і прымавак бяднейшыя на адно выказванне.

Са мной, відаць, не пагодзяцца нашы кампазітары Рычард Бутвілоўскі і Мар'ян Наско, але з песень «Я остаюсь комсомолкой» і «Песни о Римме Шершневой» я б выкінуў усе словы, да аднаго, разам з коскамі і клічнікамі. Не падумайце, што я нейкі песненавіснік. Проста прывык і ад песенных тэкстаў патрабаваць (так, так, патрабаваць) складу, ладу хоць нейкага, ну і яшчэ... сэнсу. Прывык. І пакуль што мяне ад гэтага яшчэ не зусім адвучылі...

Дык вось, трапіліся мне на вочы дзве песні. Абедзве на словы І. Панкевіча. Абедзве пра гераінь Вялікай Айчыннай вайны. Абедзве для моладзі. І вельмі падобныя адна да адной.

Грозные дни отступили.
Смолкли навеки войны отголоски...
Только людские сердца не забыли
Подвига Люси Чаловской.
(«Я остаюсь комсомолкой», музыка Р. Бутвілоўскага).

Смолкли раскаты орудий,
Вновь наступила весна.
Римму страна не забудет,
С нами сегодня она.
(«Песня о Римме Шершневой», музыка М. Наско).

Ці не праўда — амаль блізняты? Але гэта не самае галоўнае. Гэта толькі выпадковыя сляды паточнай работы, нявінны вынік халоднай штампоўкі. Самае галоўнае—там, дзе апісваецца, так сказаць, сутнасць.

Вось, напрыклад, як кораценька абмалявана баявая дзейнасць Люсі Чалоўскай:

Славная дочь Белоруссии
Била фашистов гранатой и миной!
И трепетали враги перед Люсей
Даже в берлоге звериной.

Здорава? Якая смеласць — проста брала міну і біла фашыстаў мінай... па галаве. Быў бы ў яе аўтамат ці пісталет, дык яшчэ туды-сюды, а то—мінай. Тут, вядома, нават калі і ў бярлогу, хай сабе і ў звярыную, залезеш, дык не схаваешся...

Не менш маляўніча апісваюцца і подзвігі Рымы Шаршнёвай:

Римма на помощь спешила,
Чтоб командира спасти.
Сердцем горячим закрыла
Раны его на груди.

Бачыце, як самааддана—не бінтам карысталася, а сэрцам, і не адну рану закрыла, а адразу ўсе, і не дзе-небудзь, а на грудзях камандзіра. Апісана ўсё дакладна і ясна.

Пасля такога, ужо як нешта абсалютна звычайнае, успрымаеш перлы, накшталт:

В городе подлый предатель
Выследил девушку, рыская волком...
(«Я остаюсь комсомолкой»).

Або:

Милая Родина, здесь я!
В трудный готова поход.
И к партизанам Полесья
Римма ушла через фронт.
. . . . . .
Смелость бессмертием встала
За героинею в ряд —
Смелость, что крепче металла,
Та, что не знает преград.
(«Песня о Римме Шершневой»).

А я, наіўны, думаў, што на песню можа натхніць толькі сапраўдная паэзія, толькі словы, якія нельга з песні выкінуць. Глупства! Вось жа натхніліся Мар'ян Наско і Рычард Бутвілоўскі... А, можа, яны думалі, што музыка можа не толькі прыкрыць, а і акрыліць усялякае глупства, прымітыўную непісьменнасць?.. Відаць, усё-такі адвучаць мяне, урэшце рэшт, ад майго недарэчнага і смешнага пераканання, што і ў песенным тэксце павінны быць склад і лад. «Старо!» — як казаў адзін аматар звышзамежных аркестраў, дзе скрыпкі і трамбоны замяняюць пілы і пустыя бочкі з-пад газы...

Кажаце, здзекуюся, смяюся я?.. Не, таварышы, мне хочацца плакаць. Тым больш, што песні на словы І. Панкевіча (абедзве) Рэспубліканскі Дом народнай творчасці Беларусі аддрукаваў на ратапрынце ў колькасці 1000 (тысяча) экземпляраў і прапануе ў рэпертуар самадзейных калектываў пад рубрыкай «Насустрач фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі», а пра «Я остаюсь комсомолкой» нават і піша: «У песні яркі, вобразны тэкст...» Вось так. Які ўжо тут смех!..

Нупрэй СУПОНЬКА.

Трыццаць роляў аўтазаводца Яфімава

да бліжэйшага тэлефона, пакуль дазвоніцца да бліжэйшага аддзялення міліцыі, след матацыкла, як кажуць, паспее прастыць. Ды і як яму захавацца, гэтаму следу, калі па шашы мімо магазіна ў абодвух напрамках праходзяць за дзень не дзесяткі, а сотні самых розных машын...

Вось чаму і не вельмі спадзяваліся на ўдачу работнікі віцебскай міліцыі, калі па сігналу трывогі выехалі за дваццаць кіламетраў ад горада, у вёску Яроміна, дзе неяк красавіцкім вечарам адбылося вось такое ж абрабаванне. З імі паехаў і Іван Данілавіч Зянькоў, і, верны свайму правілу не ўмешвацца ў дзеянні аператыўнікаў, каб не перашкаджаць ім, моўчкі, быццам збоку, назіраў за іх работай, цярпліва прыслухоўваўся, як і пра што распытваюць яны ўсё яшчэ ўзрушанага перажытым страхам прадаўца. А той здолеў расказаць зусім нямногае. Прыехалі трое на матацыкле сіняга колеру з каляскай... Спынілі машыну вось тут, ля абочыны... Вадзіцель застаўся за рулём, а двое пасажыраў зайшлі ў магазін, прыгразілі зброяй і, схапіўшы грошы, кінуліся назад. Адзін ускочыў на задняе сядло, другі ў каляску... Што? Не, нумар матацыкла прадавец не паспеў заўважыць. Твары? Ды хіба разгледзіш, калі ў іх кепкі былі амаль на самыя вочы насунуты! У што апрануты? А хто іх ведае, было не да таго...

— М-да, — прабурчаў, а можа ўздыхнуў старшы аператыўнай групы, — нястая работа. Хаця б які-небудзь след пакінулі. Ні-чо-га!

Толькі цяпер Іван Данілавіч дазволіў сабе ўмяшацца. Перш за ўсё ён яшчэ раз удакладніў месца, дзе на кароткія хвіліны спыняўся матацыкл. Тут? Тут: вось і след пратэктара, што адціснуўся на вільготнай пасля ўчарашняга дажджу зямлі абочыны.

— Асцярожна, таварышы, — папрасіў Зянькоў, — не затапчыце.

І, стаўшы на калені, пачаў аглядаць адбітак.

След, як усялякі іншы, як у любой машыны: у елачку. Але побач з ім яшчэ адзін: след нагі гаспадара матацыкла, і вось на ім — самае каштоўнае, самае неабходнае ў гэтыя мінуты — дыяметрам двухкапеечнай манеты выемка-зорачка, адцісненая падэшвай бота ці чаравіка! Не-не, не бота, не чаравіка, а туфля: вузкі насок, модны абцас. О, як усё гэта важна. Значыць, шафёр малады, любіць модны абутак. Значыць, шукаць злачынцу трэба сярод маладых матацыклістаў!

Беражліва, як здабытак незвычайнай каштоўнасці, схаваў Зянькоў гіпсавы злепак следу. Усё, можна ехаць. А ў Віцебску ў той жа дзень пачалася праверка ўсіх гарадскіх матацыклаў.

Сініх машын з каляскамі аказалася не менш за семдзесят штук. Дык якая ж з іх? Для работнікаў ГАІ не цяжка было адсеяць са спісу тыя, якія ў дзень абрабавання магазіна былі няспраўныя. Засталося трошкі больш за пяцьдзесят. Пасля адсеву пажылых вадзіцеляў і такіх, каго нельга западозрыць у злачынстве, спіс скараціўся да дваццаці двух матацыклістаў. Каторы з іх?

Падазронасць упала на ўласніка машыны ІЖ-56 з нумарам гарадской аўтаінспекцыі «17-67 ВАТ» Генадзя Шадрына: малады хлопец, франт, у мінулую нядзелю шчодра гульнуў у рэстаране. Праўда, маглі і памыліцца, тым больш, што Шадрын ледзь не з гневам і абурэннем адвяргаў такое, як ён сказаў, «абуральна-бязглуздае» абвінавачанне! Але варта было Зянькову папрасіць Шадрына зняць з левай нагі туфель, варта было прадэманстраваць, з якой дакладнасцю супадае гіпсавы злепак з зорачкаю на яго падэшве, як замест гневу і абурэння ў хлопца вырвалася спалоханае, разгубленае:

— Гэта не я. Гэта яны мяне прымусілі, яны!

— Хто?

Нават самы вопытны злачынца рэдка дзейнічае ў адзіночку. Ён заўсёды шукае саўдзельнікаў, выбіраючы і спакваля падрыхтоўваючы іх да будучых злачынстваў і, як правіла, спыняе свой выбар на слабахарактарных, на аматарах «лёгкага» заробку, «салодкага» жыцця: на такіх, каго можна спачатку купіць, потым запалохаць, а ў выпадку правалу і зваліць увесь цяжар віны. Генадзя Шадрына і знайшлі, і «апрацавалі», і падрыхтавалі да злачынства Памазкоў і Мурачоў, якія не адзін раз адбывалі пакаранне за злодзейства і рабаўніцтва, — ім патрэбен быў чалавек з матацыклам.

І адказваць за абрабаванне магазіна ў вёсцы Яроміна давялося ўсім тром.

Вопытны злодзей Мікалай Сальцэвіч, які пасля адбыцця пакарання вярнуўся ў родны Віцебск, зусім не думаў, што «водпуск» з месц зняволення акажацца для яго дужа нядоўгім. Наадварот, Мікалай лічыў, што яму пашэнціла: вызвалілі датэрмінова, ды па дарозе дадому, у цягніку, удалося прыхапіць набіты рознымі рэчамі чамадан нейкага разявакі. Праўда, сярод рэчаў у чамадане аказаўся пашпарт гэтага разявакі, выдадзены на імя Сегера Седзіану, але ад пашпарта Сальцэвіч пазбавіўся проста: запячатаў у канверт і кінуў у паштовую скрынку на Віцебскім вакзале. Знойдуць паштавікі і перашлюць уласніку.

І якое ж было здзіўленне «адпускніка», калі літаральна на наступны дзень пасля вяртання дадому па яго нечакана-негадана прыехалі работнікі міліцыі! Усё знайшлі: і ўкрадзены ў цягніку чамадан, і ўсе рэчы, якія так і не паспеў збыць. Сальцэвіч нават пакрыўдзіўся:

— Хоць бы тыдзень далі перадыхнуць.

А калі яго везлі разам з забранымі рэчамі з дому, пацікавіўся:

— Вам што, варажбітка на мяне паказала? Ці можа новы сродак супраць нашага брата вынайшлі?

Але ўсё аказалася і больш складана, і проста.

Паштовыя работнікі даставілі канверт з пашпартам у лінейны аддзел міліцыі станцыі Віцебск. Праз гадзіну начальнік аддзела Васіль Іванавіч Квасноў прывёз і пашпарт, і канверт у навукова-тэхнічны кабінет абласнога ўпраўлення аховы грамадскага парадку. Яшчэ праз паўгадзіны Іван Данілавіч Зянькоў узяўся за апрацоўку іх спецыяльнымі хімічнымі рэактывамі. Пасля гэтага на апрацаваных паверхнях выразна праступілі адбіткі пальцаў. Адкінуўшы тыя з іх, якія належалі ўласніку пашпарта Сегеру Седзіану, бо на канверце іх і не магло быць, крыміналіст вылучыў і з асаблівай стараннасцю вывучыў адзін адбітак: вялікага пальца не сегераўскай, а нечай чужой рукі. Чыёй? След магла пакінуць рука работніка пошты, які адносіў канверт з пашпартам у чыгуначную міліцыю. Маглі адбіцца на канверце і пальцы супрацоўнікаў міліцыі, і самога Васіля Іванавіча Кваснова, — любога, хто ў гэты дзень трымаў канверт у руках. І толькі калі ўсе гэтыя меркаванні былі праверены, а ўслед за тым і адпалі адно за адным, Івану Данілавічу стала зусім ясна: на канверце адбітак пальца пакуль невядомага злодзея.

На наступную раніцу, калі скончылася праверка дакументаў аб злачынцах, якія раней судзіліся ў Віцебску, гэты невядомы стаў вядомы: ім аказаўся злодзей-рэцыдывіст Мікалай Станіслававіч Салвцэвіч. Роўна праз дваццаць чатыры гадзіны пасля крадзяжу чамадана ў цягніку Кіеў—Ленінград ён, да невыказнага свайго здзіўлення, зноў, і на гэты раз без асаблівай надзеі на датэрміновае вызваленне, апынуўся за кратамі. А пашпарт і чамадан з рэчамі работнікі міліцыі пераслалі іх гаспадару Сегеру Седзіану.

Але, вядома, міліцыі не заўсёды ўдаецца раскрываць злачынствы з такой хуткасцю і аператыўнасцю, як гэта адбылося ў выпадку з Мікалаем Сальцэвічам. Іншы раз не дні і тыдні, а месяцы руплівай і нястомнай працы патрабуюцца для таго, каб знайсці след небяспечнага, хітрага, асцярожна-прадбачлівага злачынцы. І пошукі гэтыя інакш, чым барацьбою характараў, волі і розумаў не назавеш.

Злачынца, зацяты рабаўнік або забойца, ведае, што яго шукаюць. Ён нікому не верыць, не верыць і самому сабе, што здолеў знішчыць усе свае сляды. Ратуючыся ад немінучай помсты, ён спяшаецца ўцячы далей ад месца злачынства, набывае «ліпавыя» дакументы, мяняе адзенне, стараецца змяніць вонкавы выгляд, хаду, голас, звычкі і нават самыя звычайныя жэсты. Ён увесь час баіцца: і ўдзень, і ўначы, і нават у сне жахаецца ад найменшага шолаху або шуму!

І ўсё ж яго знаходзяць. Праз месяц або праз год — усё роўна ад помсты не ўцячэ.

Доўга, цяжка ішоў па слядах аднаго з такіх злачынцаў Іван Данілавіч Зянькоў. Доўга і цяжка таму, што слядоў гэтых аказалася вельмі і вельмі мала. Вераснёўскім ранкам на бульбянішчы, што прылягае да лесу, метрах у шасцістах ад свайго

[Заканчэнне на 4-й стар.].



Бабуля, дзе ты!

Фотаэцюд Г. ФРАЛОВА.

Мікалай Канстанцінавіч ЧАРКАСАЎ

Савецкае мастацтва панесла вялікую страту. Памёр выдатны мастак нашага часу, адзін з любімейшых народам артыстаў тэатра і кіно, член КПСС Мікалай Канстанцінавіч Чаркасаў.

Гісторыя савецкага мастацтва непарыўна звязана з імем Мікалая Канстанцінавіча, які аддаў тэатру і кіно амаль паўстагоддзя свайго яркага і плённага жыцця.

М. К. Чаркасаў нарадзіўся ў 1903 годзе і 16-гадовым юнаком прыйшоў у тэатр. Пачаўшы свой сцэнічны шлях як артыст Петраградскага тэатра оперы і балета, М. К. Чаркасаў скончыў затым Ленінградскі інстытут сцэнічных мастацтваў і ўступіў у 1926 годзе ў трупу ленінградскага Тэатра юнага гледача. З 1933 года і да апошніх дзён свайго жыцця ён працаваў артыстам Ленінградскага акадэмічнага драматычнага тэатра імя А. С. Пушкіна.

Тут сфарміраваўся і вырас яго велізарны сцэнічны талент, які вылучыў М. К. Чаркасава ў лік лепшых драматычных акцёраў сучаснасці.

Артыст вялікага таленту, шырокага творчага дыяпазону, высокай культуры і інтэлекту, М. К. Чаркасаў застанецца ў памяці савецкага народа як стваральнік выдатных вобразаў. Дэпутат Балтыкі Паляжаеў і сучасны фізік Дронаў, Аляксандр Неўскі і Іван Грозны, Максім Горкі і Іван Мічурын, Уладзімір Стасаў і Уладзімір Маякоўскі, Паганель і Дон-Кіхот — кожны з гэтых вобразаў стаў для мільёнаў гледачоў сапраўдным адкрыццём, крыніцай глыбокіх перажыванняў і роздумаў аб жыцці. Акцёрскае мастацтва Чаркасава адзначана здзіўляючай сілай пераўвасаблення, пранікненнем у глыбіні чалавечых характараў, высокім і тонкім майстэрствам.

М. К. Чаркасаў — адзін з тых майстроў нашай культуры, хто бачыць у сваёй творчасці грамадзянскае, партыйнае служэнне інтарэсам грамадства, у якім непарыўна зліліся акцёр і перадавы грамадзянін сваёй краіны. Палымяна ўлюбёны ў жыццё, ён паспяхова спалучаў напружаную творчую работу з вялікай грамадскай дзейнасцю. Ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета РСФСР першага і другога скліканняў, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР трэцяга і чацвёртага скліканняў, быў членам Савецкага камітэта абароны міру, членам прэзідыума і старшынёй Ленінградскага аддзялення Усерасійскага тэатральнага аб'яднання.

Краіна высока ацаніла выдатныя заслугі М. К. Чаркасава ў галіне мастацтва, узнагародзіўшы яго двума ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і іншымі ўрадавымі ўзнагародамі. Пяць разоў яму прысуджалася Дзяржаўная прэмія СССР. У 1947 годзе яму прысвоена ганаровае званне народнага артыста СССР.

Апошняй работай выдатнага артыста ў кіно была роля акадэміка Дронава, за якую ён быў удастоены Ленінскай прэміі. М. К. Чаркасаў тут гаворыў «не!» скептыцызму і бязвер'ю. Ён сцвярджаў актыўныя, камуністычныя адносіны да жыцця, ярка раскрываючы тыповыя рысы перадавога савецкага чалавека. «Усё застаецца людзям», — гаварыў Чаркасаў—Дронаў.

Людзям застанецца не толькі памяць пра выдатнага акцёра і чалавека Мікалая Канстанцінавіча Чаркасава, але і яго высакароднае мастацтва, якое будзе захапляць і ўзвышаць яшчэ многія пакаленні людзей.

Л. І. Брэжнеў, Г. І. Воранаў, А. П. Кірыленка, А. М. Касыгін, К. Т. Мазураў, А. Я. Пельшэ, М. В. Падгорны, Д. С. Палянскі, М. А. Суслаў, А. М. Шалепін, П. Е. Шэлест, В. В. Грышын, П. М. Дземічаў, Д. А. Кунаеў, П. М. Машэраў, В. П. Мжаванадзе, Ш. Р. Рашыдаў, Д. Ф. Усцінаў, В. В. Шчарбіцкі, Ю. В. Андропаў, І. В. Капітонаў, Ф. Д. Кулакоў, Б. Н. Панамароў, В. С. Толсцікаў, Г. А. Багданаў, Г. І. Папоў, В. Ф. Шаура, З. М. Круглова, А. А. Сізоў, Г. І. Казлоў, К. А. Фурцава, А. В. Раманаў, Н. А. Кузняцоў, С. Ф. Бандарчук, А. Ф. Барысаў, С. А. Герасімаў, Ю. А. Завадскі, А. Г. Іваноў, І. В. Ільінскі, М. Н. Кедраў, Г. М. Козінцаў, Л. А. Куліджанаў, Л. Ф. Макар'еў, В. В. Мяркур'еў, М. П. Ахлопкаў, Р. Н. Сіманаў, Н. К. Сіманаў, Г. А. Таўстаногаў, Ю. В. Талубееў, І. Е. Хейфіц, В. І. Часнакоў, М. І. Цароў, Д. Д. Шастаковіч.

ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ

Барыс Марозаў пасябраваў з фотаапаратам яшчэ ў школе. І гэтае захапленне засталося, відаць, назаўсёды. Барыс і прафесію сабе выбраў адпаведную — цяпер ён працуе асістэнтам кінаапаратара на Мінскай студыі навукова-папулярных і дакументальна-хранікальных фільмаў.

Сёння мы прапануем некалькі фотаработ Барыса Марозава.

Зняцацку.

Амаль як тата.



Напагатове.

Горача.

Ірына.

Ля вечнага агню.

КРЫНІЦА СВЯТЛА

ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. ДРАГАМАНАВА

У маі 1878 года ў Парыжы, пад старшынствам Віктора Гюго, адбываліся пасяджэнні Сусветнага кангрэсу літаратараў. Членам кангрэсу быў раздадзены тэкст даклада—кароткага нарыса гісторыі ўкраінскага народа, яго культуры і літаратуры. У Інстытуце марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС, у фондзе Карла Маркса захоўваецца экземпляр гэтага даклада з паметкамі заснавальніка навуковага камунізма. Аўтарам даклада быў выдатны ўкраінскі вучоны-сацыёлаг, гісторык, грамадска-культурны дзеяч, літаратуразнаўца, публіцыст, фалькларыст, рэдактар і выдавец Міхаіл Пятровіч Драгаманаў. Увагу Карла Маркса прыцягнулі і бліскучыя публіцыстычныя артыкулы Міхаіла Драгаманава, прысвечаныя «ўсходняй» праблеме і руска-турэцкай вайне 1877—1878 гадоў.

Палітычныя творы выдатнага дзеяча ўкраінскага народа чытаў Ул. І. Ленін. Высока ацанілі Міхаіла Драгаманава—«украінскага Герцэна» — А. Жалябаў, Г. Пляханаў, Ул. Караленка, Максім Горкі, Леў Талстой, акадэмік А. Веселоўскі, Ул. Бонч-Бруевіч, Іван Франко і іншыя прагрэсіўныя дзеячы навукі і культуры. А. Луначарскі ў 1914 годзе ў артыкуле «Шаўчэнка і Драгаманаў» пісаў: «Шаўчэнка для ўкраінцаў, а за імі і для шырокай дэмакратыі—багатая крыніца святла! Але і Драгаманаў застаецца крыніцаю святла, што здзіўляе дальназоркасцю, яркасцю і прыгажосцю свайго розуму і застанецца вялікім настаўнікам, які дальназоркасцю і праўдалюбнасцю не ніжэйшы за самога Чарнышэўскага». З глыбокай павагай ставіўся да выдатнага публіцыста і перакананага працаўніка царызму Міхаіла Драгаманава заснавальнік марксісцкай партыі Балгарыі Дзімітр Благоеў. У 1895 годзе ў часопісе «Дело» № 10 у артыкуле, прысвечаным памяці Драгаманава, Д. Благоеў падкрэсліваў яго выключныя заслугі перад украінскім і балгарскім народамі.

Міхаіл Драгаманаў нарадзіўся 18 верасня (па новаму стылю) 1841 года ў г. Гадзячы на Украіне. Яшчэ студэнтам Кіеўскага універсітэта прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці напаўлегальнай арганізацыі «Кіеўская грамада». Стаўшы выкладчыкам універсітэта, сваімі таленавітымі лекцыямі па ўсеагульнай гісторыі, актыўным удзелам у рабоце нядзельных школ, смелымі выступленнямі супраць рэакцыйнай школьнай сістэмы, абаронаю ўкраінскай культуры і мовы ён заслужыў вялікую папулярнасць у прагрэсіўнай часткі грамадства і выклікаў да сябе нянавісць ва ўрадавых сферах.

Міхаіл Драгаманаў вымушаны быў эмігрыраваць. У Швейцарыі (1875—1889 гг.) ён разгарнуў шырокую палітычную і літаратурную дзейнасць. З-пад яго пяра выйшаў рад баявых памфлетаў, якія выкрывалі захопніцкую знешнюю палітыку рускага царызму, яго палітыку ў нацыянальным пытанні.

За граніцаю Міхаіл Драгаманаў стварыў свабодную ўкраінскую прэсу, вакол якой аб'ядноўваліся антыманархічныя сілы і якая стала штабам сувязі рэвалюцыйных дзеячоў славянскіх краін. У Жэневе Міхаіл Драгаманаў выдаваў часопіс «Грамада», надрукаваў значную колькасць рэвалюцыйных выданняў і арганізаваў іх распаўсюджанне на Украіне, у Расіі, Балгарыі, Польшчы, Сербіі, Румыніі, Чэхіі і іншых краінах. Міхаіл Драгаманаў у сваіх творах адстойваў правы ўкраінскага народа на самастойнае развіццё, на сваю дзяржаўнасць, сваю мову, быў праціўнікам усялякага ўціску ўкраінскай нацыі, выступаў супраць мадзьярызацыі, паланізацыі, германізацыі, русіфікацыі ўкраінскага народа.

Міхаіл Драгаманаў шырока і сістэматычна знаёміў еўрапейскую грамадскасць з дасягненнямі ўкраінскай навукі і літаратуры. У сваіх творах ён пастаянна падкрэсліваў, што ўкраінскі народ вызваліцца ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту і даможацца лепшай будучыні толькі ў цесным адзінстве і пры падтрымцы рускага народа.

У 1889 годзе Міхаілу Драгаманаву было прапанавана ўзначаліць кафедру агульнай гісторыі Сафійскага універсітэта. У Балгарыі ён разгарнуў шырокую навуковую і грамадска-палітычную дзейнасць, праявіў сябе высока эрудзіраваным, бліскучым лектарам, вялікім сябрам балгарскага народа, выхавацелем навуковых кадраў гэтай краіны.

Міхаіл Драгаманаў пакінуў вялікую літаратурную спадчыну. Друкаваныя працы яго склалі б не менш трыццаці тамоў. Адна толькі эпістолія яго налічвае тысячы пісьмаў. Ён—аўтар звыш шасцідзесяці фундаментальных работ па этнаграфіі і фальклору. Найбольш значныя з іх—«Гістарычныя песні маларускага народа», «Новыя ўкраінскія песні аб грамадскіх справах», «Палітычныя песні ўкраінскага народа XVIII—XIX стагоддзяў», «Гістарычныя народныя паданні і апавяданні», «Украіна ў яе славеснасці» і многія іншыя.

Вялікую навуковую каштоўнасць маюць яго літаратурна-крытычныя работы пра пісьменнікаў В. Бялінскага, А. Герцэна, І. Тургенева, М. Кастамарава, І. Нячуй-Лявіцкага, Ю. Фядзьковіча і іншых.

Памёр Міхаіл Драгаманаў у 1895 годзе і пахаваны ў Сафіі (Балгарыя).

Міхаіл Драгаманаў належыць да выдатных палітычных дзеячоў мінулага, які сваёй творчасцю імкнуўся наблізіць лепшую будучыню працоўнага народа Украіны.

М. ГАМРЭЦКІ,
кандыдат гістарычных навук.
г. Кіеў.

БУДНІ «ЦАРЭЎНЫ»

Ксеня Рабінкіна танцуе на сцэне Вялікага тэатра ўсяго два гады. Яна выконвае сольныя партыі ў «Жызелі», «Лебядзіным возеры», «Дон Кіхоце», «Золушцы». Першыя крокі, як прынята гаварыць у такіх выпадках. Першыя радасці — яе імя друкуюць у афішах; першыя поспехі — прапановы выступіць у Канцэртнай зале імя Чайкоўскага, на студыі тэлебачання, у Калоннай зале Дома Саюзаў. Але пакуль у сям'і Рабінкіных адна прымабалерына — 24-гадовая Алена, якая выступала на сцэнах Парыжа, Лондана, Варшавы, Прагі, Дэлі. Пра яе — сотні пахвальных рэцэнзій на розных мовах свету. Поспех сястры дарагі Ксені. Не ў кожнай балерыны такі лёс: проста з балетнага класа ў вядучыя танцоўшчыцы Вялікага тэатра.

Але слава сястры наводзіць і на сумныя думкі. Ксеня пачынае сумнявацца ў сваім таленце. «Іпахондрыя», праўда, працягваецца нядоўга: цвёрды характар маці, пяшчота сястры і патрабавальнасць выкладчыка — вядомай рускай балерыны Елізаветы Гердт — памагаюць зноў паверыць у сябе. І зноў паўтараюцца бясконцыя экзерсісы — аднастайныя, аднатонныя, а ў іх і трапятанне Жызелі, і лірычнасць Аўроры.

...Ксеня жартуючы гаворыць, што жаданне танцаваць з'явілася ў яе раней, чым прарэзаліся малочныя зубы. У тры гады яна заявіла бацькам, што будзе балерынай. Да чатырох год пераглядзела ўсе балеты, у якіх танцавала яе маці — Ала Цабель, у мінулым характарная балерына. Асабліва дзяўчынцы спадабаўся «Дон Кіхот». У пяць год яна да самазабыцця закахалася ў Галіну Уланаву і падоўгу не адыходзіла ад яе партрэта, што вісеў у пакоі маці.

Ала Цабель расказвае: «У нашым доме часта збіраліся людзі мастацтва, у асноўным артысты Вялікага тэатра. Прыходзілі балерыны, дырыжор Юрый Фаер, тады яшчэ малады балетмайстар Леанід Лаўроўскі. Мы абмяркоўвалі новыя спектаклі, радаваліся з'яўленню маладых «зорак». Мой муж, чалавек тэхнічнай прафесіі — ён зараз загадвае кафедрай інстытута нафтахімічнай і газавай прамысловасці, — назваў нашы сустрэчы «Клубам Тэрпсіхор і іншых». Дочкі вельмі любілі прысутнічаць на «пасяджэннях» клуба. У выніку яны зрабілі выснову, што адна палавіна чалавецтва складаецца з балерын, другая — са спевакоў. А асабліком — іх тата і дзядуля, дзіцячы хірург. Дзяўчынкі пыталіся ў іх: «Чаму вы таксама не танцуеце?» А калі падраслі, ужо свядома аддалі сэрца класічнаму балету.

...З харэаграфічным вучылішчам Вялікага тэатра звязваюць мары многія дзяўчынкі і хлопчыкі з усіх савецкіх рэспублік. Конкурс тут без перабольшання — грандыёзны. На кожнае месца прэтэндуе 20—30 чалавек. Толькі вялікі прафесіянальны вопыт і вострая інтуіцыя памагаюць педагогам выбраць лепшых. Сярод пераможцаў 1953 года аказалася Ксеня Рабінкіна.

На працягу дзевяці год Ксеня ўпарта авалодвала адразу дзвюма навукамі: яна вучылася мастацтву класічнага танца і... працавітасці. Педагог Соф'я Галоўкіна вырашыла паспрабаваць яе сілы ў сольнай партыі. І не памылілася ў выбары: 13-гадовая Ксеня эмацыянальна і тэхнічна выканала танец Амуры ў балеце Мінкуса «Дон-Кіхот». Зразумела, у зале была ўся сям'я Рабінкіных на чале з 86-гадовым дзядулем.

Потым зноў насталі рабочыя будні: практыкаванні ля балетнага станка, паўтарэнне «маленькіх адажыо», піруэтаў, фуэтэ...

І сёння яе дзень увесь запоўнены. Я пераканалася ў гэтым, дамаўляючыся з Ксеняю аб сустрэчы. Замест адказу яна прыгадала: «З адзінаццаці раніцы да дванаццаці— клас, ну, увогуле, трэніровачныя заняткі. Потым — трохгадзінная рэпетыцыя. Затым — урок французскай мовы. А з сямі гадзін да поўначы буду на «Масфільме».

Мы сустрэліся раніцай...

Ужо паўгода Ксеня здымаецца ў фільме вядомага савецкага рэжысёра Аляксандра Птушко «Казка пра цара Салтана», яна іграе ролю царэўны, якую злосны чарадзей ператварыў у белага лебедзя. Ксеня з дзяцінства любіла гэты паэтычны вобраз і таму вырашыла ненадоўга пакінуць балетную музу. Яна дамовілася з адміністрацыяй тэатра і паехала ў Севастопаль на здымкі. Аднак балерына ні на хвіліну не думае мяняць прафесію. Па яе разуменню, сучасны чалавек не павінен абмяжоўвацца толькі вузка прафесіянальнымі інтарэсамі. Гэта збядняе яго жыццё, пазбаўляе яго разнастайнасці.

Праца балерыны забірае вельмі шмат часу. І ўсё-такі Ксеня знаходзіць гадзіну-другую і для манежа. Яна ўхітраецца не прапускаць ніводнай выстаўкі жывапісу. І нават пасяджэнні маладзёжнай секцыі Усерасійскага тэатральнага аб'яднання праходзяць пры яе ўдзеле. Гэта секцыя, больш правільна яе актыў, арганізоўвае вечары-сустрэчы творчай моладзі Масквы, наладжвае прагляды і абмеркаванні новых савецкіх і зарубежных фільмаў.

Сябрам і сяброўкам прысвячаецца перадвыхадны вечар. Заходзяць Анастасія і Марыяна Вярцінскія, таварышы Эдуарда Марцэвіча — мужа Алены. Марцэвіч — вядучы артыст Драматычнага тэатра імя Маякоўскага. (Дарэчы, ён піша і п'есы). Эдуард пазнаёміў Ксеню з маладымі чытальнікамі, мастакамі, паэтамі. Моладзь танцуе, слухае старадаўнюю і сучасную музыку. У кампаніі высока цэніцца жарт, востры, маланкавы. Тады смяюцца ад душы, чакаючы зараз жа новага жарту.

Бацькам Ксені да спадобы маладыя людзі, якія бываюць у іх доме. Яны нагадваюць іх уласную маладосць, калі нястрымная адданасць мастацтву, якая спалучалася з весялосцю і ненасытнасцю жыцця, клікала да напружанай, усёпаглынаючай працы.

Людміла БІРЧАНСКАЯ
(АДН).

МАЛАДЫЯ МАЙСТРЫ КІРГІЗСКАГА КІНО

Не так даўно савецкія і зарубежныя гледачы пазнаёміліся з мастацкім фільмам «Спякота». Гэта работа студыі «Кіргізфільм» была ўдастоена прэмій на міжнародных кінафестывалях у Карлавых Варах (Чэхаславакія) і Франкфурце-на-Майне (ФРГ). Галоўную ролю выканаў выпускнік Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі Болат Шамшыеў. Ён стварыў вобраз праўдзівы, па-сапраўднаму чалавечны. Дэбют маладога кіргізскага кінематаграфіста быў прызнаны ўдалым.

І вось другі дэбют Болата Шамшыева, але ўжо на ніве рэжысуры. Ён ажыццявіў пастаноўку дакументальнай стужкі «Манасчы», у якой перад намі паўстаў выдатны кіргізскі сказіцель Саякбай Каралаеў, які захоўвае ў памяці дзесяткі тысяч радкоў цудоўнага народнага эпасу «Манас». Кінанарыс «Манасчы» атрымаў прыз па жанру навукова-папулярных карцін на міжнародным кінафестывалі ў Обергаўзене (ФРГ) і быў прэміраваны на нядаўнім Усесаюзным кінафестывалі ў Кіеве.

Творчы лёс Болата Шамшыева характэрны для сучаснага кіргізскага кінематографа.

— У нас у рэспубліцы многія значныя творы кіно робяцца за апошні час маладымі майстрамі, узрост якіх не перавышае 28 гадоў,—гаворыць старшыня Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў Кіргізскай ССР Шэршан Усубаліеў.—Маладыя майстры ўпэўнена выходзяць на адказныя рубяжы мастацтва. Гэта можна сказаць і пра кінарэжысёраў, і пра акцёраў, і пра аператараў.

Зусім нядаўна кінагледачы рэспублікі цёпла сустрэлі новы мастацкі фільм «Самая паслухмяная». У аснову яго пакладзена аповесць дваццацісямігадовага кіргізскага празаіка Камбаралы Бабулава «Дзяўчына з поўдня». Рэжысёры-пастаноўшчыкі Бекеш Абдылдаеў і Леанід Гурэвіч — аднагодкі пісьменніка. Большасць акцёраў таксама маладыя. У карціне ўсхвалявана расказваецца пра лёс кіргізскай дзяўчыны, натуры глыбокай і чыстай, пра яе першае каханне. Аўтары карціны паказваюць рост самасвядомасці жанчын Савецкага Усходу.

«Мацярынскае поле» — так называецца фільм па аднайменнай аповесці пісьменніка Чынгіза Айтматава, які здымае цяпер малады рэжысёр Генадзь Базараў. Выпускнікі Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі Талемыш Акееў і Кадыр Амуркулаў пачалі работу над мастацкай стужкай «Паша Бакая». Іх калега Меліс Убукееў здымае карціну «Дзевятае мая» па сцэнарыі маладога празаіка Кубатбека Джусубалієва.

Аляксей КАМАРОЎ
(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

16 верасня

Першая праграма. 11.00 — «Панарама радзімы» (М). 11.30 — іграе ансамбль салістаў сімфанічнага аркестра Маскоўскай дзяржфілармоніі (М). 12.10 — для школьнікаў і малодшых школьнікаў. «Займальная азбука» (М). 16.40 — праграма перадач. 16.45— для школьнікаў. «Ластаўка». Тэлевізійны часопіс. Перадача з Тбілісі. 17.15 — «Эканамічныя праблемы СЭУ». Перадача другая (М). 17.40 — тэлевізійныя навіны. 18.05 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Біяграфія мужнасці». Пра героя грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайнаў генерала Я. С. Алёхіна. 18.30 — Кубак СССР па футболу. «Дынама» (Кіеў) — «Спартак» (Масква). Перадача з Кіева. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 20.15 — «Эстафета навін» (М). 21.15 — «Эскадра ідзе на захад». Мастацкі фільм. Вытворчасць Адэскай кінастудыі. 22.45 — новыя кнігі выдавецтва «Ураджай». 23.00 — «Пластыка танца». Канцэрт салістаў балета Бухарэсцкага тэатра оперы і балета. Перадача з Бухарэста.

Другая праграма. 17-40 — у эфіры — «Маладосць». «Народжаныя Кастрычнікам» (М). 18.30 — для дзяцей. «Стары Хатабыч». Мастацкі фільм. 19.55 — «Крыніца натхнення». Фільм-канцэрт. 20.50 — «Пасля гонга» Тэленарыс. 21.10 — рэклама, аб'явы. 21.15 — М. Горкі. «Муж і жонка Арловы». Тэлевізійны спектакль (М).

17 верасня

Першая праграма. 13.55 — праграма перадач. 14.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Выстаўка Бураціна» (М). 14.30 — для школьнікаў. Т. Макарская. «Не сябраваў хлопчык з дзяўчынкай». Тэлевізійны спектакль (М). 15.25 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 15.45 — дзіцячы экран. «Таптыжка», «Мамутэк». Мультыплікацыйныя фільмы. 16.00 — «Бывайце, хлопчыкі». Кінаэцюд пра выпускнікоў сярэдніх школ. 16.30 — тэлевізійныя навіны. 17.00 — міжнародная таварыская сустрэча па лёгкай атлетыцы паміж зборнымі камандамі СССР і Францыі. Перадача з Кіева. 18.50—«Клуб кінападарожнікаў» (М). 19.45—«На агеньчык» (М). 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — «Літары са скрынкі радыста». Мультыплікацыйны фільм (М). 21.20 — «Акно сатыры» (М). 21.35 — «Вясёлыя пласцінкі». Фільм-канцэрт. 21.50— «Жанчыны». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі імя М. Горкага. Дзецям да 16 год глядзець не дазваляецца.

Другая праграма. 15.45 — «Лістоўніцы». Кінафільм (М). 16.00 — тэлевізійныя навіны (М). 16.30 — народны музей. «За ўладу Саветаў!» (М). 17.00 — спартыўная перадача. 19.30 — «Для жыцця». Тэлевізійны нарыс. 20.00 — рэклама, аб'явы. 20.05 — «Васіль Андрэеў». Кінафільм. 21.35 — «Малочнік з Мяэкюля». Мастацкі фільм (М).

18 верасня

Першая праграма. У дапамогу завочнікам (для тэхнікумаў). 8.15 — «Дэталі машын». Лекцыя трэцяя. 9.00 — музычны антракт. 9.10 — «Тэарэтычная механіка». Лекцыя трэцяя. 9.55 — праграма перадач. 10.00 — для школьнікаў. «Будзільнік» (М). 10.30 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. 11.00 — для школьнікаў. «Вялікім і маленькім». Сустрэча з дзіцячымі пісьменнікамі (М). 12.00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Савецкі воін». Кіначасопіс (М). 12.30 — у свеце мастацтваў. «Польскі плакат». Перадача з Варшавы. 13.00— «Гвардзейцы». Перадача, прысвечаная 25-годдзю Савецкай гвардыі. 13.25 — «Піянерскі касцёр». Тэлевізійны часопіс. 14.00 — маскоўскі Крэмль учора і сёння. «Красная плошча» (М). 14.30 — «Музычны кіёск» (М). 14.55 — «Лясная наша старана». Перадача, прысвечаная Дню работніка лесу (М). 15.35—«Паркі Беларусі». Перадача другая. 16.00—эстрадны канцэрт. 17.00—міжнародная таварыская сустрэча па лёгкай атлетыцы паміж зборнымі камандамі СССР і Францыяй. Перадача з Кіева. 19.00 —у эфіры—«Маладосць». «Вы служыце, мы вас пачакаем» (М). 20.30 —тэлевізійныя навіны (М). 21.00— тэлевізійны тэатр мініяцюр. «Ці шчаслівыя багатыя?» (М). 22.00 — вясёлая праграма. Перадача з Сафіі.

Другая праграма. 15.35 — па вашых просьбах. Канцэрт (М). 16.05—гутаркі ля раяля. М. Мусаргскі. «Малюнкі з выстаўкі» (М). 17.00 — эстрадны канцэрт. 18.30— наш кінаглобус. «Маладосць Кубы». Кінанарыс. 19.00 — канцэрт. 21.30 — «Дзеці Дон-Кіхота». Кінакамедыя. Вытворчасць кінастудыі «Масфільм».

НЯМЫЯ СВЕДКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 2—3-й стар.).

дома, быў знойдзены труп аршанскага чыгуначніка Уладзіміра Браніслававіча Пабядзінскага, забітага двума стрэламі з паляўнічага ружжа. Ніхто са сваякоў або суседзяў загінуўшага не чуў стрэлаў. Ніхто не бачыў паблізу ніводнага нетутэйшага чалавека. Хто ж мог забіць, хто забіў Пабядзінскага? І за што, з якой мэтай?

Агляд трупа і навакольнай мясцовасці амаль нічога не даў. Работнікі міліцыі толькі і знайшлі адзін кардонны, два лямцавыя пыжы ад паляўнічых патронаў, кавалак абгарэлага мяшка ды невялікую драўляную лапатку, выструганую з дошкі. А зямля к часу іх прыбыцця была ўжо настолькі вытаптаная, што ў блытаніне слядоў наўрад ці мог хто-небудзь разабрацца.

Іван Данілавіч і сам амаль не верыў, што яму ўдасца знайсці хоць бы маленькую зачэпку. Слядоў — мноства, адзін на другім, амаль у некалькі пластоў, побач лес. Можа, забойца і не выходзіў на ўзараны ўчастак, а проста адтуль, з лесу, страляў у Пабядзінскага? Стрэліў і пайшоў, а на траве ў гэты час была раса, і след злачынцы, вядома ж, не захаваўся... І ўсё ж Зянькоў сантыметр за сантыметрам абследаваў увесь участак, адзін за другім расшыфроўваючы сляды: якія з іх належаць забітаму, якія — суседзям Пабядзінскага, што збегліся да месца здарэння, і работнікам міліцыі, а якія...

— Стоп! — ледзь не крыкнуў ён, знайшоўшы адметны ад усіх астатніх, адзіны, выразны адбітак кірзавага бота з гумавай падэшвай. — Бадай, гэта іменна тое, што мне трэба!

А побач з гэтым адбіткам знайшоў другі такі ж, і ў ім — самае каштоўнае для крыміналіста: кавалачак, не больш за чатыры сантыметры, спрасаванай зямлі, на якім нават няўзброеным вокам была відаць лічба «40», якая сведчыла аб памеры абутку. Беражліва, ледзь не затаіўшы дыханне Іван Данілавіч спачатку сфатаграфаваў знаходку, а потым таксама асцярожна зрабіў з яе гіпсавы злепак. І толькі пасля гэтага, падабраўшы абгарэлую мешкавіну і драўляную лапатку, накіраваўся да міліцэйскай машыны: тут яму, крыміналісту, больш не было чаго рабіць.

«Мешкавіна не ў лік, — думаў ён, — мяркуючы па ўсім, яна належала забітаму: не стане ж забойца цягаць з сабою нейкія анучы. А вось лапатка...»

Вярнуўшыся, Зянькоў перш за ўсё начыста змыў з лапаткі прыліплую да яе зямлю і толькі пасля гэтага пачаў дасканала вывучаць, даследаваць знаходку. Зроблена з дошкі, хутчэй за ўсё адарванай ад нейкага штыкетніку: захаваўся папярэчны след перакладзіны, да якой гэтая дошка была прыбіта цвіком. У цэнтры лапаткі дзірка ад цвіка з падцёкамі іржаўчыны, якія так і засталіся, што яшчэ раз дае падставу для ўпэўненасці ў правільнасці першапачатковага меркавання. Спачатку яе абчэсвалі сякераю з дробнымі зазубрынкамі на лязе, захаваліся сляды гэтых зазубрынак, якіх не зблытаеш ні з якімі іншымі, а потым апрацавалі на стругальным станку, — вось яны, падоўжныя выпуклыя валікі, якія так і засталіся пасля апрацоўкі. Ну што ж, сёе-тое ёсць, застаецца высветліць галоўнае: дзе, ад якога штыкетніку адарваў злачынца дошку?

І ўмомант раптоўная здагадка ледзь была не адкінула ўвесь ход стройных лагічных разважанняў: «А што, калі лапатку зрабіў не забойца? Што, калі яна належала забітаму?»

У такіх выпадках нават бліжэйшым сваякам верыць нельга: могуць або не ведаць, або памыліцца. І, нягледзячы на запэўненні жонкі Пабядзінскага, што ў іх у доме ніколі не было ні такой дошкі, ні такой лапаткі, Іван Данілавіч абышоў і агледзеў усе бліжэйшыя дамы і ўсе агароджы, пакуль не пераканаўся, што нічога падобнага паблізу і ў паміне няма.

Значыць, лапатка належала забойцу!

А дзе, ад якога штыкетніку ён адарваў для яе дошку? Дзе і якой сякерай высякаў, на якім станку абстругоўваў?

Давялося паставіць на ногі амаль усю аршанскую міліцыю. Дзень за днём, вуліцу за вуліцаю абыходзілі міліцыянеры, аглядаючы літаральна кожны паркан. І, нарэшце, на Тэкстыльнай вуліцы знайшлі тое, што трэба. А за штыкетнікам, у двары, убачылі некалькі хлявоў, ля аднаго з якіх на зямлі валяліся трэскі...

Гаспадара хлява, Рыгора Антонавіча Казлоўскага, дома не аказалася: паехаў тры дні назад, а куды — нават сваякам не сказаў. Затое вобыск, зроблены ў яго доме і ў хляве, не толькі пацвердзіў усе меркаванні Івана Данілавіча, але і прымусіў яго ў думках вылаяць самога сябе: чорт вазьмі, якога ж маху ён ледзь было не даў з кавалкам абгарэлай мешкавіны! Бо з мяшка, ад якога ададралі той кавалак, былі зроблены анучы Казлоўскага, знойдзеныя ў кутку пад яго ложкам, а разам з імі аказаліся і кірзавыя боты саракавога памеру на гумавай падэшве.

А лапатка? Ці яго гэта лапатка, ці Казлоўскага?

Устанавіць гэта было ўжо няцяжка. У хляве знайшоўся другі кавалак усё той жа дошкі. Знайшлася і сякера, якою злачынца абчэсваў сваю лапатку, і нават трэскі, знойдзеныя ля хлява, аказаліся іменна ад яе.

Але забойца паспеў схавацца. Куды? І на што ён мог разлічваць?

Па фотаздымках, якія забойца пакінуў дома, работнікі аховы грамадскага парадку знайшлі мярзотніка. Народны суд аддаў злачынцу належнае, прыгаварыўшы яго да расстрэлу. Крыміналіст Іван Данілавіч Зянькоў і на гэты раз выканаў свой службовы абавязак.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 13054